Сямейная газета



**Заняткі для «маленькіх прынцаў»**



**Калі восень сапсавала настрой**



**Вёску на горад не прамяняем**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Генадзь БАЛБАТОЎСКІ, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва:**

*«У апошнія гады адзначаецца павелічэнне ахопу школьнікаў летнім аздараўленнем. У летнюю кампанію 2018 года гэты паказчык узрасце да 35% ад колькасці дзяцей школьнага ўзросту. Будучым летам, як і ў папярэднія гады, пуцёўкамі ў лагеры будуць забяспечаны ўсе ахвотныя і тыя юныя грамадзяне, якія маюць патрэбу ў аздараўленні. На летнюю аздараўленчую кампанію 2017 года было накіравана з рэспубліканскага бюджэту 39,4 млн. рублёў. На летніх канікулах 2017 года ў лагерах усіх тыпаў аздаравіліся 368 тысяч дзяцей».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 2.11.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9760 | ▲ |
| Еўра | 2,2988 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0339 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0735 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

2 ЛІСТАПАДА 2017 г. ЧАЦВЕР №212 (28576)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ДАЙ БОГ, І МЫ АХВЯРУЕМ СЭРЦЫ ДЛЯ РОДНАЙ ЗЯМЛІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дзяды. Валожынскі раён.

■ Спадчына

## СВЯТЫНЯ НА СХІЛЕ

### Як ратуюць старажытную Каложу

**Новы этап работ вядзецца на драўлянай частцы, якая складае амаль палову царквы. Падчас рамонту зменяць абшыўку, установяць новыя вокны і дзверы, узнімуць частку даху. Будоўля ідзе без прастояў, каб паспець да канца снежня асвоіць сродкі, якія выдзелены з Фонду Прэзідэнта сёлета ў ліпені.**

### Куды знікла сцяна

Знакаміты мураваны храм XII стагоддзя толькі часткова адпавядае часам пабудовы. А калі ўзірацца на яго, напрыклад, з набярэжнай Нёмана, ён бачыцца як звычайная драўляная царква. Такі выгляд Каложа набыла не так даўно — у канцы XIX стагоддзя. Драўляную сцяну вымушаны былі зрабіць замест мураванай, разбуранай паводкай. І цяпер ад крутога абрыву царкву аддзяляе ўсяго два метры. Блізкасць Нёмана — самая крытычная акалічнасць, якой на працягу некалькіх стагоддзяў стараюцца супрацьстаяць, каб выратаваць храм.

Згодна з архіўнымі дакументамі, у 1720 годзе размыты ракой схіл падышоў да самай царквы. Паўднёвая сцяна нахілілася. Каб спыніць апоўзень, было загадана пабудаваць каля падэшвы гары плот, высадзіць дрэвы. Аднак гэта мала дапамагло, і рака працягвала разбураць схіл. Спрыялі гэтаму плаціна і гавань на другім беразе, ад чаго рэчышча змянілася, і вада імкліва падступіла да Каложы. У 1845 годзе храм закрылі, бо на адной са сцен з'явілася пагрозлівая расколіна. Гэта частка разам з усёй паўднёвай сцяной у ноч з 1 на 2 красавіка 1853 года абрынулася ў Нёман...

СТАР. 13

■ Майстар-клас ад прадзедаў

## НАГАМ ЦЁПЛА — СЭРЦУ РАДАСНА!

**Зімою ў вёсачках Дрыбінскага раёна становіцца зразумела, які ў мясцовых жыхароў самы распаўсюджаны промысел. Да надыходу маразоў мясцовы майстар апранае і абувае ўсю сям'ю — з цёплай авечай воўны вырабляюць тут валёнкі, рукавіцы і шапкі-магеркі.**

СТАР. 4



Сучасныя валёнкі аздобленыя малюнкамі на любы густ.

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ КАШТОЎНЫЯ ПРЫЗЫ!

Пачалася падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ Чулі?!

# 500-я ТРАНСПЛАНТАЦЫЯ ПЕЧАНІ



Фота БЕЛТА.

Пяцісотую аперацыю па перасадцы печані праводзіў кіраўнік Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансплантацыі органаў і тканак Алег РУМО.

**Стандартнае хірургічнае ўмяшанне пацыенту з цырозам, які развіўся на фоне гепатыту С, адбылося 29 кастрычніка. Зараз прааперыраваны адчувае сябе добра.**

Першая аперацыя па перасадцы печані была выканана яшчэ ў 2008 годзе. «Калі мы зрабілі сотую такую аперацыю, а гэта было ў 2011-м, то адчулі сябе сапраўдным прафесійным калектывам, здольным вырашаць буйныя задачы, — кажа **кіраўнік Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансплантацыі органаў і тканак Алег РУМО.** — Зрабіўшы 500 трансплантацый печані, мы трапілі ў згуртаванне людзей, якія гэтыя аперацыі робяць даўно і на вельмі высокім узроўні». Цэнтр ажыццяўляе цяпер каля 50 перасадак печані ў год.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

■ Май на ўвазе!

## З амерыканскімі візамі праблем больш не будзе?

**Пасольства Злучаных Штатаў у нашай дзяржаве плануе пачаць выдачу турыстычных віз для ўсіх беларусаў у пачатку 2018 года. Пра гэта заявіў учора часовы павераны ў справах ЗША ў Беларусі Роберт РАЙЛІ.**

«Мы плануем адкрыць магчымасць падачы заяў для атрымання неміграцыйных віз для ўсіх грамадзян Рэспублікі Беларусь у пачатку 2018 года. Упершыню за 10 гадоў любы жыхар Беларусі зможа прыйсці ў пасольства ЗША ў Мінску, каб атрымаць амерыканскую візу, не будзе неабходнасці ехаць у суседнія краіны», — акцэнтаваў увагу суразмоўнік. Дыпламат растлумачыў, што на гэта рашэнне паўплывала пагаршэнне адносін паміж Злучанымі Штатамі і Расіяй. «Закрыццё візавых паслуг для грамадзян Беларусі ў пасольстве ЗША ў Маскве паскорыла гэты працэс. Мы зразумелі, што няпросты працэс атрымання візы, з якім даводзілася сутыкацца беларускім грамадзянам, стаў яшчэ больш складаны. Мы пастараліся паскорыць пашырэнне візавых паслуг, каб складанасці ў адносінах паміж Расіяй і ЗША не паўплывалі на грамадзян Беларусі», — падкрэсліў ён.

«Упершыню за 10 гадоў мы маем намер пашырыць консульскія паслугі ў Мінску. Сёння мы робім першы крок: зніжаем узроставы парог для заяўнікаў на атрыманне неміграцыйных віз з 70 да 50 гадоў», — праінфармаваў Роберт Райлі. Ён удакладніў, што гэтае новаўвядзенне будзе дзейнічаць ужо з 1 лістапада. Яно закране выдачы гасцявой, турыстычнай і дзелавых віз (катэгорыя В1 / В2). «Вядома, для маладых людзей гэта здаецца даволі высокай перашкодай, але што зробіш: узроставае зніжэнне адкрые магчымасць атрымаць візу вялікай колькасці грамадзян Беларусі», — упэўнены дыпламат.

Роберт Райлі пакуль не змог назваць канкрэтную дату, калі пачне дзейнічаць зазначанае рашэнне, паколькі пасольству неабходна яшчэ правесці падрыхтоўчую работу. З 1 лістапада пачынае дзейнічаць яшчэ адно новаўвядзенне: заяўнікі любога ўзросту, чыя амерыканская віза любой катэгорыі скончылася менш за год таму, таксама могуць звярнуцца па новую візу ў Мінску. Усе астатнія працэдуры звароту па візы застаюцца без змен. Роберт Райлі падзякаваў ураду Беларусі і Міністэрству замежных спраў за цеснае супрацоўніцтва па названым пытанні.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Факт

## ТРАГЕДЫЯ НЕ ЗАБЫВАЕЦЦА

**На скрыжаванні вуліц у гарадскім пасёлку Карма адкрыты памятны знак ахвярам халакосту. Ён выкананы з чорнага мармуру.**

Ініцыятарамі выступілі Кармянскі раённы выканаўчы камітэт і раённы Савет дэпутатаў пры падтрымцы міжнароднага грамадскага аб'яднання «Валюнтас». Дарэчы, у ліпені 1941 года, пры нямецкай акупацыі, у райцэнтры былі створаны мужчынскае і жаночае гета. У іх утрымлівалася каля 1,5 тыс. яўрэяў. 8 лістапада 1941 года вязняў прывялі да яра побач з населеным пунктам і расстралялі. На памятным знаку надпісы на іўрыце і на рускай мове: «Вечная память евреям, безвинно погибшим от рук нацистов в ноябре 1941 года» і на беларускай: «Помнік ахвярам фашызму — вязням Кармянскага гета».

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### МЗС Узбекістана высвятляе асобу выканаўцы тэракта ў Нью-Ёрку

Консульская служба знешнепалітычнага ведамства Узбекістана высвятляе асобу і грамадзянства выканаўцы тэракта ў Нью-Ёрку, які забраў напярэдадні жыцці васьмі чалавек, заявіў прадстаўнік МЗС Узбекістана.

Паводле звестак паліцыі, тэрарыст на пікапе на высокай хуткасці праехаў тры кварталы па выдзеленай для веласіпедыстаў паласе, збіўшы некалькі пешаходаў і веласіпедыстаў. Зламыснік урэзаўся ў школьны аўтобус, пасля чаго машына спынілася. Калі зламыснік вылез з кабіны са зброяй у руках, паліцыя адкрыла па ім агонь, параніўшы яго. Мяркуемы тэрарыст быў дастаўлены ў бальніцу.

Як удакладніў на прэс-канферэнцыі начальнік гарадской паліцыі Джэймс О'Ніл, зброя, якую меў пры сабе тэрарыст, аказалася пнеўматычнай. Па інфармацыі тэлекампаніі Сіэнэн, злачынца, выйшаўшы з аўто, крычаў лозунгі ў славу Алаха. Пазней стала вядома, што ў яго была пры сабе запіска, у якой ён сцвярджаў, што дзейнічаў у імя так званай Ісламскай дзяржавы.

Па інфармацыі СМІ, гэтае нападзенне стала самым буйным па колькасці ахвяр у Нью-Ёрку з часоў нападу на вежы-блізняты ў 2001 годзе.

### Пры абвалах у тунэлі палігона Пунгеры ў КНДР маглі загінуць да 200 чалавек



Каля 200 чалавек, верагодна, загінулі ў КНДР у выніку абрушэння пароды ў адным з тунэляў, якія будуюцца, у раёне ядзернага палігона Пунгеры (павет Кільджу, правінцыя Хамгён-Пукто). Пра гэта паведаміў японскі тэлеканал The Asahi Shimbun.

Паводле яго звестак, каля 100 чалавек, якія працавалі на будаўніцтве тунэля, маглі апынуцца пад заваламі ў выніку першага абвалу пароды. Яшчэ каля 100 чалавек, як мяркуецца, загінулі падчас пошукава-выратавальнай аперацыі, паколькі адбыўся яшчэ адзін абвал пароды. Час, калі адбыліся гэтыя інцыдэнты, не называецца. Прычынай абвалу, верагодна, стала правядзенне ў верасні аднаго з ядзерных выпрабаванняў, у выніку якога парода на некалькі кіламетраў ад месца яго правядзення стала рухомай. У канцы верасня і ў кастрычніку ў раёне палігона былі зафіксаваныя падземныя штуршкі, канчатковыя высновы аб прыродзе якіх зрабіць не ўдалося.

### Пытанне аб пахаванні цела Леніна можна вырашыць на рэферэндуме

Пахаванне цела Леніна адбудзецца, калі будзе знойдзены неканфліктны спосаб вырашэння гэтага пытання — такое меркаванне 1 лістапада выказала спікер Савета Федэрацыі Валянціна Мацвіенка.

Паводле яе слоў, Ленін на Краснай плошчы — частка расійскай гісторыі. «І я лічу, што ісці напралом, ламаць цераз калена ў такіх пытаннях нельга. Упэўнена, некалі перапахаванне адбудзецца. Яго можна будзе ажыццявіць тады, калі грамадства прыйдзе да кансэнсусу па гэтай тэме», — заявіла В. Мацвіенка.

Яна адзначыла, што ёсць цэлае пакаленне, для якога імя Леніна значыць вельмі многае. «Гэтыя людзі маюць права разлічваць на паважлівае стаўленне да сваіх перакананняў, ідэалаў, якія яны пранеслі праз усё сваё жыццё. Яшчэ адзін ачаг супрацьстаяння краіне не патрэбны. І таму, я думаю, будзе знойдзены нейкі спакойны, неканфліктны спосаб вырашэння гэтай праблемы», — растлумачыла спікер.

На яе думку, гэтае пытанне можа быць вырашана з дапамогай рэферэндуму. Але гэта адбудзецца «не сёння і не заўтра».

## ЁСЦЬ ПРАБЛЕМА — ВАМ СЮДЫ!

**Ва ўсіх рэгіёнах краіны 4 лістапада пройдуць рэгулярныя прамыя тэлефонныя лініі з уладамі. Тысячы пытанняў і не менш адказаў. Некаторыя праблемы кіраўнікі вырашаюць не паклаўшы трубку тэлефона, іншыя бяруць пад уласны кантроль. Самыя набалелыя просьбы звычайна звязаны з камунальнымі пытаннямі і добраўпарадкаваннем тэрыторый. Пры гэтым расце і колькасць падзяк за праведзеную работу.**

Тэлефонныя лініі ў суботу з 9.00 да 12.00 праводзяць:

кіраўнік спраў БРЭСЦКАГА аблвыканкама Юрый Іосіфавіч НАРКЕВІЧ. Тэл. 8-016 221 31 21;

першы намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Алег Сяргеевіч МАЦКЕВІЧ. Тэл. 8-021 222 22 22;

першы намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Аляксандр Віктаравіч МІКАЛУЦКІ. Тэл. 8-023 275 12 37;

старшыня ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Васілевіч КРАЎЦОЎ. Тэл. 8-015 273 56 44;

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8-022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Віктар Іванавіч СІРЭНКА. Тэл. 8-017 500 41 60;

старшыня МІНСКАГА гарвыканкама Андрэй Віктаравіч ШОРАЦ. Тэл. 8-017 222 44 44.

## Пакроўскія чытанні аб'ядноўваюць усіх

**Відэаканферэнцыяй пачаліся Пакроўскія адукацыйныя чытанні «Маральныя каштоўнасці і будучыня чалавецтва», якія на працягу месяца будуць праходзіць на Гомельшчыне.**

У Гомельскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы расказалі, што форум аб'ядноўвае некалькі тысяч чалавек з усяго рэгіёна. Сярод іх прадстаўнікі органаў улады, установаў адукацыі, аховы здароўя, культуры, вайсковых часцей, падраздзяленняў МНС, МУС, грамадскіх аб'яднанняў і арганізацый, моладзь, духавенства Гомельскай і Тураўскай епархій і многія іншыя.

Па ўсёй вобласці пройдуць семінары, выстаўкі, канферэнцыі, лекцыі, круглыя сталы, адкрыюцца дыскусійныя клубы і пляцоўкі, тэматычныя секцыі. Удзельнікі Пакроўскіх чытанняў будуць працаваць па некалькіх кірунках: адукацыя, выхаванне, сацыяльнае і місіянерскае служэнне, пытанні ўзаемадзеяння царквы і моладзі, СМІ... Таксама падчас чытанняў будуць названы імёны пераможцаў абласнога конкурсу па краязнаўстве «Пазнаём Гомельшчыну разам». Пакроўскія чытанні праводзяцца штогод у кастрычніку—лістападзе ў межах рэалізацыі Праграмы супрацоўніцтва паміж упраўленнем адукацыі Гомельскага аблвыканкама і дзвюма епархіямі (Гомельскай і Тураўскай) Беларускай праваслаўнай царквы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

## Як працуе транспарт у святы?

**У сувязі з пераносам працоўных дзён у расклад руху гарадскога пасажырскага транспарту сталіцы ўносяцца змяненні.**

Як паведамілі ў дзяржаўным прадпрыемстве «Мінсктранс», 4 лістапада аўтобусныя, тралейбусныя і трамвайныя маршруты будуць перавозіць пасажыраў па графіку працоўнага дня. 5 лістапада аўтобусныя і тралейбусныя маршруты будуць працаваць па графіку суботняга дня, трамвайныя маршруты — як па выхадных днях. 6 і 7 лістапада аўтобусныя і тралейбусныя маршруты будуць абслугоўваць пасажыраў па графіку нядзельнага дня, трамвайныя маршруты — па графіку выхаднога дня

■ Не сезон

## Сіг і сом — пад забаронай

**З мэтай стварэння спрыяльных умоў для ўзнаўлення чудскага сіга з 1 лістапада па 15 снежня ў Беларусі ўстанаўліваецца забарона на яго вылаў.**

У гэты перыяд у сіга праходзіць нераст. Прэснаводны прадстаўнік сямейства ласасёвых не баіцца холаду і пачынае размнажэнне позняй восенню. А вось сом, наадварот, вельмі адчувальны да пахаладання, таму раней за іншыя віды рыб залягае на зімоўку. Пры гэтым сом становіцца практычна нерухомым, што робіць яго лёгкай здабычай на зімавальных ямах. Для захавання еўрапейскага сома ў зімовы перыяд з 1 лістапада па 31 сакавіка яго вылаў паўсюдна забаронены.

Як нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету, здабыча гэтых відаў рыб у час забароны абыдзецца парушальнікам у буйныя сумы: 12 базавых велічынь за кожную асобіну еўрапейскага сома і 9 базавых — за кожную асобіну чудскага сіга.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

**Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне вядучаму рэферэнту ўпраўлення інфармацыйных сістэм і тэхналогій Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Чукіле Святлане Анатолеўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

■ Фінансы

# Падатковы рай для вяскоўцаў

## Абласныя Саветы дэпутатаў да 1 снежня павінны прыняць рашэнні аб зацвярджэнні пераліку населеных пунктаў, на якія распаўсюджваецца дзеянне падатковых ільгот

**У мэтах развіцця гандлю, грамадскага харчавання і бытавых паслуг на тэрыторыі сельскай мясцовасці і малых гарадскіх паселішчаў з сярэдняй колькасцю насельніцтва да 10 тысяч чалавек, а таксама стварэння дадатковых рабочых месцаў, 22 верасня кіраўніком дзяржавы падпісаны Указ №345 «Аб развіцці гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання».**

Як паведамілі рэдакцыі ў інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па горадзе Мінску, Указам з 1 студзеня 2018 года па 31 снежня 2022 года прадугледжана магчымасць устанаўлення на асобных тэрыторыях спецыяльнага рэжыму падаткаабкладання ў сферы гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання. Дадзены рэжым прадугледжвае выплату падатку на прыбытак для прадпрыемстваў у памеры 6% і адзінага падатку для індывідуальных прадпрымальнікаў у памеры адной базавай велічыні, а таксама іншых спрошчаных умоў ажыццяўлення гэтых відаў дзейнасці.

Акрамя таго, прадугледжваецца на працягу пяці гадоў вызваленне суб'ектаў гаспадарання ад падатку на дабаўленую вартасць, падатку на нерухомасць, зямельнага падатку і арэнднай платы за зямельныя ўчасткі, што знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці. Абласныя Саветы дэпутатаў да 1 снежня павінны прыняць рашэнні аб зацвярджэнні пераліку населеных пунктаў і тэрыторый за населенымі пунктамі, якія адносяцца да тэрыторыі сельскай мясцовасці і малых гарадскіх паселішчаў, на якія распаўсюджваецца дзеянне вышэйзгаданых падатковых ільгот, устаноўленых Указам.

Разам з тым інспекцыя нагадвае, што дзеянне Указа не распаўсюджваецца:

— на дробны гандаль аўтамабільным палівам (дызельным палівам, аўтамабільным бензінам, газам у якасці аўтамабільнага паліва), механічнымі транспартнымі сродкамі, самаходнымі машынамі, прычэпамі (паўпрычэпамі), ювелірнымі і іншымі бытавымі вырабамі з каштоўных металаў і каштоўных камянёў;

— на аказанне бытавых паслуг па тэхнічным абслугоўванні і рамонце аўтатранспартных сродкаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** kurkach@zviazda.by

# МУЗЫКА СССР

## У даайфонную эру нашы продкі ганарыліся наяўнасцю транзістара «Мерыдыян»



Дырэктар Дудзіцкай школы мастацтваў Лідзія ЕСЬМАН.

***— Ой, такое радыё стаяла ў маёй бабулі на падаконніку!***

**Такой была мая першая рэакцыя на адзін з артэфактаў калекцыі, сабранай Лідзіяй Есьман, дырэктарам Дудзіцкай школы мастацтваў, што ў Калінкавіцкім раёне. Дарэчы, жыхары Дудзічаў і Калінкавічаў па гаражах і гарышчах назбіралі каля 40 экзэмпляраў разнастайнай гукавой апаратуры, якая сёння і прадстаўлена ў экспазіцыі.**

Музыкант па асноўнай прафесіі, Лідзія Міхайлаўна гаворыць, што сёння такую калекцыю сабраць было б ужо немагчыма. Змянілася пакаленне, і большасць пачысціла ўсе магчымыя сховішчы ад смецця. Да яго аднеслі, канешне, і тэхніку, якая сумленна адслужыла сваё. Між тым яшчэ зусім нядаўна наяўнасць пераноснага радыёпрыёмніка або магнітафона сведчыла аб статусе і заможнасці яго ўладальніка. За юнаком, які нёс, напрыклад, «Мерыдыян», што пачаў выпускацца ў Кіеве ў 1967 годзе, дзяўчаты беглі прыкладна так, як у даваенныя гады за гарманістам. Так і катушачны магнітафон «Камета» 1962 года выпуску мог дазволіць сабе мець далёка не кожны малады чалавек у другой палове мінулага стагоддзя.

Такія былі і ў Калінкавіцкім раёне, бо, калі Лідзія Есьман звярнулася з заклікам: «прыносьце, што яшчэ дзе завалялася», рарытэты сталі паступаць у імправізаваны музей. Напрыклад, намеснік старшыні раённага выканаўчага камітэта Віктар Замосцік падарыў свой транзістарны прыёмнік «Сокал».

Маю ўвагу, без сумнення, прыцягнуў 15-кілаграмовы сеткавы лямпавы радыёпрыёмнік з назвай «Звязда-54». З 1954 года яго выпускалі Харкаўскі завод «Камунар» і Маскоўскі завод «Мастпрыбор».

— Мае сваякі: свёкар, муж і брат заўсёды захапляліся апаратурай, — успамінае Лідзія Есьман. — «Звязда» належала майму брату Мікалаю. Ён вельмі доўга ім карыстаўся. Потым нарэшце захацеў яго выкінуць, але я папрасіла аддаць. З гэтага ўсё і пачалося.

Дарэчы, выпуск «Звязды» быў вельмі значнай падзеяй сярэдзіны пяцідзясятых гадоў у СССР. Корпус быў штампаваны з металу, з ужываннем нікеліравання і шматпластовага лакіравання. Знаўцы гавораць, што ён не ўпісваўся ў звыклую лінейку мадэляў шэрых прыёмнікаў і радыёл у драўляных футаралах, як двайняты падобных адзін на аднаго. Сродкі масавай інфармацыі тых гадоў апісвалі з'яўленне «Звязды-54» як велізарны прарыў у афармленчым дызайне, як апошні піск моды, што давала людзям надзею на новае, светлае жыццё.

Насамрэч радыёпрыёмнік «Звязда-54» па сваім вонкавым афармленні — поўная копія французскага «Excelsior-52» выпуску 1952 года. Ёсць версія, што яго прывезлі дыпламаты ў падарунак нейкай высокапастаўленай асобе. Па іншай — радыёпрыёмнік быў спецыяльна закуплены для капіравання і выпуску па распараджэнні вышэйшага кіраўніцтва. У пасляваенныя гады ўрадам СССР было прынята рашэнне аб абавязковым выпуску абаронnымі прадпрыемствамі яшчэ і тавараў шырокага спажывання, і «Звязда» ўпісалася ў гэтую канцэпцыю.

З 1963 года ў Рызе пачаўся выпуск партатыўнага транзістарнага радыёпрыёмніка «Селга-63». Ён, між іншым, экспартаваўся ў шэраг краін, таму надпісы на шкале і на задняй сценцы былі на рускай і англійскай мовах. У 1967 годзе прыёмнік выпускаўся з таблічкай «50 гадоў Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі», а ў 1970-м — «У. І. Леніну 100 гадоў».

Партатыўны касетны магнітафон «Легенда-401», які з 1972 года выпускаў Арзамаскі прыборабудаўнічы завод імя 50-годдзя СССР, стаў сапраўднай легендай. Ён амаль што без змен дажыў да пачатку 90-х гадоў. Радыёпрыёмнікам «Урал-аўта» цюнінгавалі свае «Масквічы» аматары пракаціцца не толькі з ветрыкам, але і з музыкай.

Відаць, многія настальгічна пачалі ўспамінаць тую тэхніку, якая стаяла ў вашым доме ў чырвоным куце. У Дудзічах ёсць магчымасць убачыць катушачныя «Маяк-201», «Арбіту», «Электроніку ТА-001», «Алімп»... Ёсць гучнагаварыцель «Сігнал» у драўляным корпусе. Ён важыць больш за тры кілаграмы. Прыбор з 1957 года выпускаўся ў тым ліку і на Гомельскім заводзе металабытавых вырабаў. Айчынную вытворчасць прадстаўляе і стацыянарны транзістарны радыёпрыёмнік «Мінск-Т». Дарэчы, гэтая мадэль атрымала Вышэйшую ўзнагароду Сусветнай выстаўкі ў Нью-Ёрку ў 1960 годзе.



Магнітафон «Камета МГ-201».

У рэтра-калекцыі не толькі прыборы, але і часопісы, якія сведчаць, што бабулі сучасных школьніц былі яшчэ тымі модніцамі. Дзяўчынкі гартаюць пажаўцелыя старонкі і толькі здзіўляюцца. Асобна прадстаўлена нумізматыка. У гэтай экспазіцыі можа і няма экспанатаў, якія б трэба было ахоўваць пад сігналізацыяй, але ж грошы з выявамі зайцоў, вавёрак і зуброў, пра якіх пакуль добра памятае сярэдняе пакаленне, для сучасных падлеткаў — сапраўдны цуд.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** iost@zviazda.by

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## СМЯРОТНЫЯ ГУЛЬНІ

**Жахлівая трагедыя адбылася ўчора ў Магілёве ў раёне мікрараёна Спадарожнік па вуліцы Загарадная шаша. Абрынулася перакрыцце пустуючага дома, дзе гулялі двое дзяцей 2007 і 2008 гадоў нараджэння. Адзін з малых загінуў, другі ў вельмі цяжкім стане дастаўлены ў рэанімацыю Магілёўскай абласной бальніцы.**



Фота БЕЛТА.

Як паведаміў афіцыйны прадстаўнік Магілёўскага абласнога УМНС Вадзім УРУБЛЕЎСКІ, сігнал на пульт дзяжурнага паступіў у 15.45. На месца выехаў пажарны аварыйна-выратавальны атрад, псіхолагі, медыцынская служба. У рабоце быў задзейнічаны кран для разбору завалу будынка.

Афіцыйны прадстаўнік УСК па Магілёўскай вобласці Аксана САЛЯНЮК дадала, што няшчасны выпадак адбыўся на тэрыторыі недабудаванага прыватнага дома, які знаходзіцца ў занядбаным выглядзе. Работу аператыўна-следчай групы, якая займаецца гэтай справай, каардынуе старшыня УСК па Магілёўскай вобласці Андрэй Ліс.

Галоўны ўрач абласной дзіцячай бальніцы Ігар КАСКО паведаміў карэспандэнту «Звязды», што 9-гадовае дзіця было дастаўлена ў бальніцу ў стане клінічнай смерці. Яно атрымала вельмі цяжкія шкілетныя траўмы і шматлікія касцявыя пераломы. У ходзе апераці была аднаўлена сардэчная дзейнасць пацыента і ён быў пераведзены ў рэанімацыйнае аддзяленне. На 18.00 учарашняга дня дзіця знаходзілася ў стане комы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** zigulya@zviazda.by

## ДЗІЦЯ НА БЕГАВЕЛЕ — ПА ПРАСПЕКЦЕ...

**У Мінску мінакі выратавалі жыццё двухгадоваму дзіцяці, якое ехала на бегавеле па праезнай частцы. Адбылося гэта некалькі дзён таму, але стала вядома толькі цяпер, калі Заводскі РАУС сталіцы выказаў шчырую падзяку неераўнадушным людзям за спагадлівасць.**

Інцыдэнт адбыўся ўвечары. У дзяжурную часць патэлефанавала жанчына, якая паведаміла, што па Партызанскім праспекце каля дома №26 па дарозе ў першай паласе на бегавеле ехала дзіця гадоў двух-трох, дарослых побач не было. Бегавел — гэта веласіпед без педаляў, у рух дзіця прыводзіць яго ўласнымі нагамі, адштурхоўваючыся ад зямлі.

Жанчына, якая званіла, забрала малечу з дарогі. На месца прыбылі супрацоўнікі ДАІ, супакоілі і дзіця, і ўсхваляваную ратавальніцу. А праз некалькі хвілін дзяжурны паведаміў, што маці знайшлася, яна сама звярнулася ў міліцыю па дапамогу ў пошуках двухгадовага сына.

Высветлілася, што маці з дзіцем выйшлі на прагулку, у нейкі момант жанчына на нешта пераключыла ўвагу і... сын на бегавеле знік у невядомым кірунку. І выехаў на праезную частку. На шчасце, побач апынуліся жанчына і малады чалавек, якія дапамаглі юнаму кіроўцу пакінуць дарогу.

## МЕТАЛ НЕ ДАЕХАЎ ДА РАСІІ

**Паблізу пасёлка Самахвалавічы Мінскага раёна супрацоўнікі УБЭЗ ГУУС Мінгарвыканкама і АБЭЗ Савецкага РУУС сталіцы затрымалі 55-гадовага мінчаніна, які ажыццяўляў нарыхтоўку лому і каляровых металаў без спецыяльнага дазволу.**

Былі выяўлены і канфіскаваны 17 490 кілаграмаў лому чорнага металу, 4 350 кілаграмаў медзі і 850 кілаграмаў лому латуні на агульную суму больш як 54 тысячы рублёў. Затрыманы растлумачыў, што планаваў перавезці лом у Расію, паколькі там яго кошт у некалькі разоў большы, чым у Беларусі. У дачыненні да мужчыны складзены адміністрацыйны пратакол за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць. Яму пагражае штраф у памеры да ста базавых велічынь з канфіскацыяй прадметаў адміністрацыйнага правапарушэння, прылад і сродкаў яго здзяйснення незалежна ад таго, у чыёй уласнасці яны знаходзяцца, а таксама даходу, атрыманага ў выніку такой дзейнасці, або без канфіскацыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** rs@zviazda.by

## МАБІЛЬНАЯ СУВЯЗЬ — НА НОВАЙ ХУТКАСЦІ

**МТС працягвае пашыраць геаграфію 4G для сваіх абанентаў. Ацаніць перавагі тэхналогіі цяпер змогуць жыхары 19 новых гарадоў і пасёлкаў Мінскай і Віцебскай абласцей. Акрамя таго, дадатковыя базавыя станцыі LTE запрацавалі там, дзе ўжо ёсць 4G ад МТС і попыт на тэхналогію высокі.**

— Сетку LTE мы пашыраем разам са сваім інфраструктурным партнёрам beCloud. Да запуску 4G у новых гарадах падыходзім комплексна: у салонах МТС і партнёраў абаненты могуць пракансультавацца па тарыфах лінейкі 4G, падключыць актуальныя паслугі і на выгадных умовах набыць смартфоны, якія падтрымліваюць рэжым сеткі LTE. Для нас важна, каб нашы абаненты маглі камфортна карыстацца перадавымі тэхналогіямі ў галіне мабільнай перадачы даных, — падкрэслівае дырэктар камерцыйнага дэпартамента МТС Мікалай БУЛАШ.

Новыя базавыя станцыі 4G адкрыліся ў Мінскай вобласці ў Вілейцы, Гатаве, Жодзіне, Забалоцці, Нясвіжы, Светлым Шляху, Слабадзе, Слуцку, Хацежыне. У Віцебскай вобласці — у Бешанковічах, Глыбокім, Докшыцах, Талачыне, Мёрах, Расонах, Сянне, Ушачах, Шуміліне і Чашніках.

Сетка LTE пачала працаваць у Беларусі ў 2015 годзе. Першым горадам, дзе запусцілі 4G, стаў Мінск. Сёння ў сталіцы налічваецца больш за 200 базавых станцый, а ўсяго па краіне іх цяпер больш за 700. Галоўнае адрозненне сеткі 4G ад папярэдніх пакаленняў — гэта хуткасць перадачы даных. У планах МТС да канца года прапанаваць паслугі на базе 4G жыхарам яшчэ 30 новых гарадоў і пасёлкаў краіны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** nikalaeva@zviazda.by

## САМ СЯБЕ АБАКРАЎ

***Лідскі прадпрымальнік наўмысна прывёў сваю фірму да банкруцтва.***

Як паведаміў начальнік Лідскага міжраённага аддзела ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Гродзенскай вобласці Андрэй ЛАГУНОЎ, прадпрымальнік П. заключыў з Лідскім прыватным прадпрыемствам дагавор пазыкі на суму 45 тыс. рублёў пад 5% гадавых. Вярнуць павінен быў праз два месяцы. Але, як толькі паступілі грошы, зняў іх з разліковага рахунка ў асабісты даход. Гэта прывяло да эканамічнай неплацежаздольнасці зарэгістраванага ім гаспадарчага суб'екта, ці, кажучы прасцей, да банкруцтва. А крэдытору нанесена маёмасная шкода ў асабліва буйным памеры.

Па гэтым факце Лідскім раённым аддзелам Следчага камітэта заведзена крымінальная справа, а на маёмасць прадпрымальніка накладзены арышт. Вядзецца расследаванне.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** margo@zviazda.by

# УТУЛЬНЫ ЭКСКЛЮЗІЎ

## Дызайнеры-валюшнікі прадставілі новыя калекцыі на «шэрсцівалі» ў Гродне

**Паказ адбыўся ў Цэнтры спадчыны. Тут можна было не толькі ўбачыць моднае дэфіле, але і паўдзельнічаць у конкурсах, майстар-класах, а таксама набыць эксклюзіўныя рэчы.**

Старажытнае, але забытае майстэрства, зноў выклікае шырокую цікавасць. Аб гэтым сведчыць і фестываль валюшнікаў, які праходзіць у Гродне трэці раз. Многія імкнуліся трапіць на майстар-класы па вырабе аксесуараў. На адным вучылі рабіць кветку на адзенне, на другім качалі шарыкі на пацеркі. Ахвотных было хоць адбаўляй. Прычым, сярод вучняў — не толькі жанчыны і дзеці, але і мужчыны. Як паведаміла **метадыст Цэнтра спадчыны Людміла ЛЕБЕДЗЬ**, многія ўдзельнікі майстар-класаў зацікавіліся шырокімі магчымасцямі выкарыстання шэрсці і пажадалі запісацца на курсы, якія тут праходзяць два разы на тыдні.

Шырокую цікавасць выклікалі вырабы майстроў, якія дэманстраваліся ў асобнай зале. Кожную работу можна назваць шэдэўрам. Дызайнеры ахвотна расказвалі пра свае калекцыі. Адна з апошніх **майстра Алены ВІТКО** носіць назву «Восень у стылі «эль». Як растлумачыла Алена, вобразы калекцыі ёй навеялі старажытныя сядзібы з восеньскім каларытам. Ужывае дызайнер у адзенні і яркую шэрсць, якую набывае на Слонімскай фабрыцы, дзе кошт даволі прымальны.

Аказваецца, у валюшнікавыя вырабы можна амаль поўнасцю апрануцца — ад сукенкі да цёплага паліто. Дапаўняюць камплекты галаўныя ўборы, сумкі, паланціны, шалікі, розныя аксесуары. Што і прадэманстравалі падчас дэфіле дзяўчаты з тэатра моды «Маладосць» Гродзенскага каледжа тэхнікі, тэхналогій і дызайну. Дарэчы, адсюль выходзіць нямала майстроў моднага адзення. Вырабы майстроў-валюшнікаў мадэлі дэманструюць толькі другі раз і з задавальненнем апранаюцца ў цёплыя рэчы. Якраз на восеньскае надвор'е.

Праўда, такія рэчы не кожнаму па кішэні. На «шэрсцівалі» больш цікавіліся, прыглядаліся, чым куплялі. Напрыклад, у калекцыі Алены цана пачынаецца з 200 рублёў. Але праца гэта не такая лёгкая, кажа майстар, на адзін выраб трэба затраціць цэлы тыдзень.

Некалькі жанчын абступілі ў цэнтры залы манекен з шыкоўным паліто. Нават дылетанту зразумела, колькі незвычайных тэхнік тут выкарыстана. **Майстар Алена РАЖАНКОВА** паказвае валакно крапівы на рукавах, шоўкавыя ўстаўкі на кішэнях. Да паліто прыстасаваны капялюш і сумка. Жанчына расказала, што рабіла гэты цуд для сябе, любімай, але гатова прадаць, калі знойдзецца пакупнік, які зможа даць за яго тысячу долараў.





За суму ад 40 да 50 рублёў можна было набыць прыгожы паланцін. **Майстар Бернарда ШЭНДЗІК** паведаміла, што свае вырабы прадае па выхадных на гарадской вуліцы рамеснікаў. Самы хадавы тавар — шалікі, а вось больш значныя рэчы ідуць складаней, хоць цікавяцца імі многія. Кажа, што кошт залежыць ад сыравіны. Майстар карыстаецца аўстралійскай воўнай, якую набывае ў Польшчы, дзе сама і пражывае. Але афармілася майстрам у Беларусі, бо тут лягчэй з дакументамі. У гэтай справе пайшла па бацькавых слядах — ён рабіў валёнкі, а сама Бернарда ў пачатку года прайшла двухмесячныя курсы ў Цэнтры спадчыны. У яе калекцыі некалькі дзясяткаў капелюшоў, якія, спадзяецца жанчына, зноў увойдуць у моду і будуць мець шырокі попыт.

Пакуль у трэндзе прыгожыя і даступныя па цане камплекты «шапка-рукавічкі». **Майстар Надзея АНЦІПЕНКА** вырабляе іх за 3—4 дні. Свае камплекты ацэньвае ў 40 рублёў. А вось маю цікаўнасць выклікаў модны жакет, за які прасілі 150 рублёў. Хоць і не танна, але відавочна, што гэта эксклюзіўная рэч. Да таго ж вельмі актуальная падчас халадоў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

# НАГАМ ЦЁПЛА — СЭРЦУ РАДАСНА!

## Дзяды яшчэ так рабілі...

Пра тое, адкуль на Дрыбіншчыне з'явілася шапавальства, існуе дзве легенды. Адна з іх расказвае, што мясцовы шляхціч аддаў некалькіх прыгонных сялян для навучання валюшнаму рамяству ў Ніжагародскую губерню. Згодна з другім меркаваннем, гаспадар маёнтка, каб павялічыць насельніцтва краю, стаў запрашаць да сябе ўсіх, каго заўгодна. Да гасціннага пана пацягнуліся людзі розных саслоўяў ды ўменняў, былі сярод іх і майстры, якія працавалі з шэрсцю.

Так ці інакш, а згодна з этнаграфічнымі даследаваннямі, шапавальства існавала тут з канца XVIII стагоддзя, і да гэтага часу захаваліся цэлыя дынастыі валюшных майстроў: сем'і Асіпоўскіх, Масаніных, Зюлікавых... Працуюць яны па дзедаўскім метадзе, калі для работы патрэбны толькі воўна, гарачая вада ды ўласныя рукі. Адсюль і знакамітасць у дрыбінскага «вырабу» — кожны майстар раскажа, чаму яго валёнкі непаўторныя, і будзе мець рацыю.

— У нас раней было мноства рамёстваў: бондарства, пляценне з лазы і саломы, ганчарства, але да сённяшняга часу дайшло толькі шапавальства, — расказвае **дырэктар Дрыбінскага раённага гісторыка-этнаграфічнага музея Жанна КЛІМАВА.** — Цікавасць да яго ўзнікла, бадай, з самага пачатку існавання музея ў 1995 годзе, але сапраўдная работа распачалася пры маёй папярэдніцы Алене Рэбкавец. Чалавек дзейсны і зацікаўлены, яна выбрала адзін з кірункаў і пачала яго развіваць. Мы выпраўляліся ў этнаграфічныя экспедыцыі, стваралі картатэку, фота- і відэаархіў, пры музеі адкрылася аб'яднанне «Шапавал» для дарослых і «Катрушнік» — для маленькіх майстроў. У 2009 годзе дрыбінскі промысел унеслі ў спіс нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі. Мы ездзілі на выставы, паступова расла цікаўнасць, з'явіліся аграсядзібы, што прапанавалі турыстам пажыць у хаце «сапраўднага шапавала», але найбольш сведчанняў і цікавінак пра старажытнае рамяство захоўваецца ўсё ж супрацоўнікамі музея.

## Гісторыя пад гарбату

У 2012 годзе супрацоўнікі выйгралі першы грант і потым у 2013—2014 гадах асвойвалі сродкі: закупілі воўну, абсталяванне, адкрылі творчую лабараторыю. Адным словам, работа з самага пачатку накіроўвалася ў культурна-асветніцкае рэчышча, так што канкурэнцыю з боку Смілавіч, калі там пачалося аднаўленне валюшнай фабрыкі, у Дрыбіне не адчулі. Затое катрушнікамі зацікавіўся турыстычны аддзел Магілёўскай вобласці.

Сёння цераз раён праходзіць турыстычны напрамак Магілёў—Дрыбін—Мсціслаў. Гасцям паказваюць майстар-класы, экскурсіі, ладзяць выязныя мерапрыемствы. Філіял у аграгарадку Расна прапануе пабывць у фітапакоі з лекавымі травамі і пакаштаваць травяны чай.

Паназіраннях Жанны Клімавай, часта турысты даведваюцца пра дрыбінскіх катрушнікаў праз інтэрнэт і пасля замаўляюць сустрэчу. Пачуць пра ўнікальных на Беларусі рамеснікаў можна на кірмашах народнай творчасці, святах з традыцыйным ухілам, падчас выстаў у Мінску, Магілёве, Смаленску. Традыцыйна ў канцы лістапада праходзіць «Дзень валёнка» — свята, якое любяць школьнікі за конкурсы і гульні. Пасля такіх мерапрыемстваў музейны гурток папаўняецца новымі ўдзельнікамі. Малым падабаецца мацаць вырабы, самім валіць воўну.

— Самыя маленькія нашы вучні — дзеткі ад сямі гадоў. Цяпер у групе займаецца 12 дзяцей два разы на тыдзень. Заняткі праходзяць так, як у сям'і дзядуля вучыў бы нашчадка. Асвойваем разам практыку мокрага валення, спрабуем фальцаваць — наносіць іголкай на валёнкі ўзоры з фарбаванай воўны. Расказваем малым пра асаблівасці краю і гісторыю рамяства, а яшчэ перадаём у спадчыну катрушніцкі лемезень, — расказвае **Таццяна ЧАРАПОВІЧ, кіраўнік народнага аб'яднання «Шапавал» і навуковы супрацоўнік музея.**



**На адзін мужчынскі валёнак трэба каля кілаграма воўны. Майстар Таццяна ЧАРАПОВІЧ параўноўвае нарыхтоўку і амаль гатовы выраб.**

Катрушніцкі лемезень — асаблівая мова дрыбінскіх майстроў. І сённія ў звычайнай гутарцы жыхароў дзенідзе, а праскочыць незразумелае для чужога вуха слова. У гэтым «разыначка» краю, бо нідзе, акрамя Дрыбіншчыны, на лемезні не размаўляюць. Мінулымі стагоддзямі вандроўныя шапавалы стварылі непаўторную гаворку, запазычыўшы асаблівасці некалькіх моў. Такім чынам узнікла асобная «прафесійная» мова з 915 унікальных слоў, якія адносіліся да абазначэння 13 сэнсавых груп: «чалавек», «прырода», «ежа», «дзеянні» і г. д. Так асцярожныя катрушнікі захоўвалі сакрэты свайго майстэрства.

— Часам надакучыць пальчыкамі воўну мяць, кінеш і збяжыш на вуліцу. Тады бацька цікавіцца: «Куды ты пахліла?» (Куды ты пайшла? — **Аўт.**) Я яго разумела, а вось тое, што да мяне звяртаюцца на катрушніцкім лемезні, не ўсведамляла, бо для нашай мясцовасці гэта мова звыклая, — успамінае Таццяна Чарапові.

## Дом шапавала

Сваё ўменне працаваць з воўнай жанчына атрымала ад бацькі. Міхаіл Іванавіч Арцёмаў валіў валёнкі для сям'і і для продажу. У хаце на стале раскладваў воўну, а сямігадовая дачка разам са старэйшым братам ужо былі побач.

Дзеці дапамагалі «таптаць» аснову для валёнка і адначасова даведваліся, як правільна раскласці воўну, як важна яе ўзважваць, каб абутак атрымаўся аднолькавы па памеры і патрэбнай таўшчыні. Унутр нарыхтоўкі закладвалі «душу» — кавалак паперы або тканіны, каб сценкі падчас валення не зліпаліся. Потым бацька качаў воўну, пакуль не атрымліваўся вялізны валёнак, які заварочвалі ў вільготную тканіну і яшчэ раз абвальвалі. Далей наступала самая цікавая для малых частка работы — нарыхтоўку палівалі кіпнем, і тая меншала ў памерах.

Ад бацькі Таццяна дазналася, як правільна закладаць калодку, каб надаць абутку форму ступні. У спрактыкаванага майстра заўсёды пры сабе некалькі калодак — на нагу дарослага мужчыны, на жаночую нагу, на ножку дзіцяці. Да калодкі ставілася пярэдняе і задняе правідла, каб сфарміраваць халяву, забіваліся кліны. І потым мокры валёнак адпраўлялі сушыцца ў гарача напаленую печ.

— Памятаю, як бацька разам з Міхеевым Канстанцінам, іншымі шапаваламі зімою выпраўляліся па суседніх раёнах. На Дрыбіншчыне здаўна існавала два промыслы — саматужны і адыходны. Пры саматужным майстар сядзеў на месцы і чакаў заказчыка, а пры адыходным катрушнікі спыняліся ў гаспадароў і, пакуль выконвалі работу, жылі пры сям'і. Нездарма ж захавалася прыслоўе: «Дзе шапавал стаў, там яго і стан». Так вандравалі цэлую зіму, а дадому перад вясной прыносілі заробак.

Пра тое, каб сур'ёзна займацца шапавальствам як прафесіяй, Таццяна не думала. Адвучылася ў школе, атрымала прафесію, выйшла замуж — і лёс павярнуўся так, што зноў аказалася дома. Дзеці раслі хутка, і дзядуля рабіў для іх абноўкі. Рамяством зацікавіўся і муж, які да таго часу з катрушніцкім промыслам не сустракаўся. Затое пасля вучобы ў цесця змайстраваў адмысловы стол для валення, з жолабам, каб гарачая вада не цякла на падлогу.

Цяпер у дом да сям'і Чарапові заходзяць дзеці з аб'яднання «Катрушнік» пры музеі — паглядзець, як вырабляюць сапраўдныя, не сувенірныя валёнкі.

Любы промысел можа стаць адметным для мясцовасці, толькі трэба яго зразумець, адчуць асаблівасць, так лічаць дрыбінскія майстры. У іх, напрыклад, гэта атрымалася. Валёнкі ад умельца-шапавала, упрыгожаныя каляровым узорам, носяць не толькі дзеля цяпла. Яны хутчэй як успамін пра вандроўку ў своеасаблівы свет катрушнікаў, пра незвычайных людзей і іх справу.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
*yurgel@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



## БАМБУКАВАЯ ПАЛКА

На дварэ ўвесь дзень імжэла. Каб хоць крыху ўзняць настрой, я вырашыла парадаваць сябе чымсьці салодзенькім. Па дарозе ў краму ўбачыла, як маці працягвае свайму малому піроржнае з узбітым крэмам. Хлопчык жа не ўтрымаў тую смакату — выпусціў на асфальт. Як гэта часта бывае, «маслам уніз». Маці адразу ж накінулася на малога: «Рукі дзіравыя!.. Я табе, што, мільянер?! Больш не прасі, не атрымаеш ніякіх піроржных!»

Я хуценька пабегла ў краму па такое ж піроржнае. Пакуль стаяла ў чарзе да касы, успомніла ўсходнюю прытчу.

Жылі ў адной вёсцы бабуля, яе дачка і ўнучак. Аднойчы маці вярнулася пасля цяжкага дня ў полі дадому. Сабрала на стол і паклікала абедаць свайго чатырохгадовага сыночка. За ядой хлопчык стаў дурэць, раскідваць рыс з талеркі.

Маці пачала сварыцца на малога:

— Ты што робіш? Хіба можна так абыходзіцца з рысам? Ведаеш, колькі мне трэба працаваць, каб ты мог паесці ўволю?

Схапіўшы доўгую бамбукавую палку, яна ўдарыла сына. На плач унука прыбегла бабуля.

— Пачакай, навошта ты крыўдзіш дзіцятка?

Дачка не стала тлумачыць маці, у чым правініўся малы, а замест гэтага груба адказала:

— Мой сын, што хачу, тое і раблю.

Бабуля моўчкі падняла з падлогі бамбукавую палку і стала біць ёй дачку.

— За што ты мяне б'еш? — завыла тая.

А бабулька, працягваючы абсыпаць яе ўдарамі, прыгаворвала:

— Мая дачка, што хачу, тое і раблю, мая дачка, што хачу, тое і раблю...

...Суседзі, што жылі над нашай кватэрай, пастаянна сварыліся. Ні дня не праходзіла без крыку. Прычым скандал мог адбыцца з-за нямытага посуду, разбітага слоіка з сокам... Яны, відаць, думалі, што гэтага ніхто не чуе. Бо на людзях паводзілі сябе зусім па-іншаму. Хадзілі за ручкі, называлі адно аднаго «мілая, мілы, сонейка, зайчык». Але ж ёсць людзі, якім нават няважна, чуе хто ці не.

Неяк вярталася з Вільні. Да адпраўлення цягніка заставалася хвілін 10. Мажная кабета адправіла мужа ў дзьюці-фры па алкаголь. У вагон мужчына з пакункам ускочыў ледзь не ў апошнюю секунду. «Паспеў», — выдыхнуў. Але, як высветлілася, купіў не той каньяк, што хацела яго жонка. Жанчына не стрымлівала сябе. Выпаліла ўсё, што думае пра свайго «адзінага і непаўторнага». Што ён «нават алкаголь купіць не можа без яе», што «бязрукі, безгаловы». І як яна з ім, бедная, жыве столькі гадоў, трывае. Усім у цягніку хацелася праваліцца скрозь зямлю ад сораму за жанчыну і няёмкасці за яе мужа.

Ужо не першы раз лаўлю сябе на думцы, што большасць людзей чамусьці рэдка ставяць сябе на месца іншых. Хоць ва ўсіх рэлігіях ёсць такая фраза: «Не рабі іншаму таго, чаго не хочаш сабе». Якраз пра гэта, яшчэ да таго, як выйсці замуж, я размаўляла з адной мудрай сямейнай парай. Мы ехалі ў адным купэ з Мінска да Санкт-Пецярбурга. Я ўсю дарогу з захапленнем назірала, з якой непадробнай пяшчотай і клопатам яны ставіліся адно да аднаго! Менавіта Людміла Іванаўна дала мне надзвычай каштоўную параду, якой я сёння карыстаюся ў сваім сямейным жыцці. «Што б ні здарылася, заўсёды будзь для свайго мужа і дзетак адвакатам. Суддзі і пракуроры і так знойдуцца. І ніколі не павышай голас, не крычы, а тым больш не падымай руку на сваіх родных. Нават у парыве адчаю ці крыўды. Шчасце любіць цішыню і пяшчоту».

Памятаеце гісторыю пра Вецер і Сонца? Аднойчы яны паспрачаліся, хто з іх мацнейшы. «Паглядзі, — сказаў Вецер, — як я зараз налячу на вандроўніка і імгненна сарву з яго плашч!». І тут жа пачаў дзьмуць з усяе сілы. Але чым больш стараўся, тым мацней захутваўся вандроўнік у плашч і прыспешваў свайго вернага каня. Сонца ж нічога не сказала. Проста ўсміхнулася, выглянула з-за аблокаў і абагрэла вандроўніка. Неўзабаве ён зняў свой плашч і прывязаў да сядла... Як бачыце, пяшчотай і дабрынёй можна дабіцца значна большага, чым сілай ды злосцю.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*


# Сямейная газета

Выпуск №21 (88)


■ Тыя, хто побач

# Незвычайныя гульні для «маленькіх прынцаў»,

## або У дзяцей з аўтызмам ёсць будучыня



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Яшчэ некалькі гадоў таму большасць беларускіх бацькоў ставіла крыж на паспяховай будучыні сваіх «маленькіх прынцаў» (*так называюць малых з аўтызмам. — Аўт.*) Але ў апошні час шмат што, дзякуй богу, змянілася. З'явіліся школы з інклюзіўным асяроддзем, цьютары, тэатр, дзе ў ролі акцёраў выступаюць і дзеці з аўтызмам, стартаваў праект «Спорт-інклюзія». Вялікай радасцю для мам і татаў стала адкрыццё ў Мінску інклюзіўнага цэнтра падтрымкі і суправаджэння сем'яў пры міжнароднай дабрачыннай грамадскай арганізацыі «Дзеці. Аўтызм. Бацькі».**

**Мы сустрэліся са спецыялістам па сэнсарнай інтэграцыі Інклюзіўнага цэнтра Аляксандрам ГАЛАМОНАВЫМ перад заняткам з яго першым падапечным Ільёй. І пагаварылі пра маленькія і вялікія перамогі.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

■ Знайсці сябе

# «БАРБАРА І ЭДУАРДА»:

## сумеснае ча-ча-ча са смакам бульбы



**Яркія касцюмы, гукі самбы, румбы і ча-ча-ча, запальныя танцы... Хтосьці скажа, што гэта карнавал у Бразіліі, і... не будзе мець рацыі. Усю гэтую гарачую і пазітыўную атмасферу з лёгкасцю можа арганізаваць дуэт з Кубы «Барбара і Эдуарда» — Барбара Гравэ дэ Перальта і Эдуарда Ферэр Сангез.**

**Цяпер яны жывуць у вёсцы Валошава каля Слуцка. Беларусь стала для іх не толькі падарожжам у незвычайную краіну, але і другім домам, дзе яны знайшлі адно аднаго. Галоўным заняткам зараз для Барбары і Эдуарда з'яўляецца вывучэнне рускай мовы. Але, нягледзячы на свой графік, яны знайшлі час і з радасцю пагадзіліся пагаварыць з намі.**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

■ Добрая справа

# АЎКОЦІКІ

## Як дапамагаць, купляючы паштоўкі

**Сёння ў Беларусі больш за 1000 сем'яў выхоўваюць дзяцей з аўтызмам. Каб хоць бы крыху палегчыць фінансавыя затраты бацькоў на лячэнне, быў створаны дабрачынны праект «Добрыя паштоўкі Аўкоцікі».**

### ЯК ГЭТА ПРАЦУЕ

— Ідэя дапамагаць сем'ям, якія сутыкнуліся з праблемай дзіцячага аўтызму, з'явілася пасля сустрэчы з былымі аднакласнікамі, — расказвае **кіраўнік праекта Марына РОМАН.** — У адной з маіх школьных сябровак ёсць сын. У два гады ўрачы паставілі хлопчыку гэты дыягназ.

Аб аўтызме я ведала і раней, але пасля той сустрэчы значна паглыбілася ў тэму. Лекаў, як вядома, няма, але абсалютна дакладна даказана, што калі з самага ранняга ўзросту развіваць такіх дзяцей і займацца іх сацыялізацыяй, то вынікі будуць неймаверныя. Аднак рэабілітацыя сёння каштуе вялікіх грошай. Не ўсім бацькам гэта па кішэні. І вось тут і з'явілася думка арганізаваць інтэрнэт-краму па продажы паштовак. А атрыманыя грошы перадаваць не толькі на дабрачынны рахунак сына маёй знаёмай, але і іншым дзецям.

Сёння праект «Аўкоцікі» сабраў каля 20 валанцёраў — аднадумцаў, якія займаюцца самымі рознымі справамі. Хтосьці малюе паштоўкі, хтосьці адказвае за юрыдычныя пытанні, хтосьці клапоціцца аб сайце, — каб ён быў зручны і зразумелы для карыстальнікаў.

— Спачатку мы нават не ведалі, што нашай асноўнай аўдыторыяй стануць посткросеры (посткросінг — праект, створаны дзеля магчымасці атрымання паштовак з усяго свету. — **Аўт.**), — расказвае Марына. Ідэя была ў тым, каб стварыць сэрвіс па адпраўцы друкаваных паштовак. Напрыклад, вы хочаце парадаваць каго-небудзь прыгожай карткай: выбіраеце яе ў нас на сайце www.aukotiki.by, пішаце ў заяўцы пажаданне або паведамленне атрымальніку, а мы, у сваю чаргу, усё прыгожа афармляем і адпраўляем ад вашага імя.

Сёння «Добрыя паштоўкі Аўкоцікі» падтрымліваюць чатырох дзяцей. Але пазней, калі праект «падрасце», іх стане больш, запэўнівае Марына. Ужо зараз стваральніцы «Аўкоцікаў» пішуць удзячныя пакупнікі і людзі, якім проста спадабалася сама ідэя праекта.

— Мы рэгулярна абнаўляем і пашыраем асартымент аўтарскіх паштовак, стараемся рабіць прыемныя дробязі. Напрыклад, укладваем дадатковую паштоўку-сюрпрыз у кожны заказ.

Сумы, якія мы рыхтуем да пералічэння ў сем'і, пакуль невялікія. Але спадзяёмся, што гэта толькі пачатак і пазней у нас з'явіцца магчымасць пералічваць кожнаму з дзяцей 100—500 рублёў штомесяц. А пакуль радуемся таму, што мінімум адну паштоўку ў дзень у нас ужо купляюць.

Яшчэ ў нас ёсць вялікая і, мабыць, трохі амбіцыйная мара: з цягам часу, калі знойдзем спонсараў, стварыць першую ў Беларусі спецыялізаваную вёску «Аўкоцікі», дзе людзі з дыягназам аўтызм маглі б жыць і весці агульную хатнюю гаспадарку.



Таццяна ПУЧКОВА — адна з першых мастакоў, якія далучыліся да праекта.




Паштоўкі на розны густ можна набыць на сайце aukotiki.by.

### ЯК ДАЛУЧЫЦЦА ДА ПРАЕКТА

Сярод першых мастакоў праекта былі малодшая сястра Марыны Кацярына і адна з яе добрых сябровак **Таццяна ПУЧКОВА.**

— Шмат гадоў я маю справу з «сухім» акадэмічным дызайнам, — кажа Таццяна. — І калі выпадае магчымасць папрацаваць над творчымі, мастацкімі заказамі, вельмі радуюся. За сваю кар'еру я намалявала шмат паштовак на зусім розную тэматыку і для розных мэт, але праект «Аўкоцікі» — гэта асаблівае задавальненне для мяне. Бо тут я малюю не дзеля грошай і не для дарослых сур'ёзных заказчыкаў, а для дзяцей, для душы, для радасці. Вядома, важная і сама ідэя звярнуць увагу людзей на праблему дзяцей з аўтызмам. Мне здаецца, наша грамадства не вельмі гатова разумець людзей з асаблівасцямі. У нас прынята быць моцнымі і здаровымі, і мы часта баімся і аспрэчваем праблемы іншых проста праз няведанне. Задача «Аўкоцікаў» — прыбраць гэты бар'ер неразумення, заахвоціць людзей быць больш добрымі адно да аднаго.

Пасля таго як праект «раскруціўся», пачалі паступаць прапановы і ад іншых мастакоў. Такім чынам, база ілюстратараў увесь час расце, а асартымент паштовак пашыраецца.

Сёння далучыцца да «Аўкоцікаў» вельмі проста. Любы ахвотны, і гэта не толькі ілюстратар або прафесійны мастак, можа стаць валанцёрам і маляваць паштоўкі. Дастаткова напісаць на электронны адрас: marinaroman@yandex.ru.

**Ганна БАГІНО.** *bahino@zviazda.by*

■

Сярод тых, каму дапамагаюць «Добрыя паштоўкі Аўкоцікі», — 8-гадовы **Ігар РАДЗЬКО.** Яго мама Марыя ўспамінае:

— Прыкметы аўтызму ў нас, як і ў большасці, праявіліся не адразу. Турбавацца я пачала, калі сын не рэагаваў на сваё імя, гадзінамі бегаў з кута ў кут, не разумеючы, што адбываецца навокал. Наш тата не вытрымаў — здаўся, пайшоў. Ды і сябры сталі сароміцца выходзіць з намі на вуліцу з-за дзіўных паводзін Ігара. Але свет не без добрых людзей. Знайшліся мамы, якія таксама гадуюць дзяцей з аўтызмам. Яны расказалі мне пра метады лячэння, якія даюць добрыя вынікі.

Зараз мы прайшлі чатыры курсы рэабілітацыі. На ўсё гэта з вялікай цяжкасцю ўдавалася сабраць грошы, адмаўляючы сабе літаральна ва ўсім. Але эфект сапраўды добры. Вось толькі на тое, каб працягнуць заняткі і замацаваць станоўчую дынаміку, грошай пакуль не хапае.

# Незвычайныя гульні для «маленькіх прынцаў»...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Што такое сэнсарная інтэграцыя, і як яна можа дапамагчы дзецям з аўтызмам?***

— Сэнсарная інтэграцыя — гэта рэабілітацыйны метад, які праз адчуванні дапамагае значна палепшыць жыццё дзіцяці: павысіць яго здольнасць да навучання, наладзіць узаемадзеянне з навакольным светам. Заняткі праходзяць у форме своеасаблівай гульні.

Першапачаткова гэты метад быў распрацаваны не для «маленькіх прынцаў», а для хлопчыкаў і дзяўчатак, у якіх ёсць праблемы з сэнсорыкай. Джын Айрэс, якая вынайшла яго, заўважыла, што часта праблемы з навучаннем узнікаюць не таму, што дзеці няздольныя, гэта можа быць звязана з асаблівасцю апрацоўкі зрокавай, слыхавой, тактыльнай, вестыбулярнай інфармацыі. Напрыклад, вучню з сэнсарнымі парушэннямі складана ўлоўліваць тое, пра што кажа настаўнік, ён пачынае нервавацца, круціцца, не можа засяродзіць увагу, праяўляе нейкія незвычайныя паводзіны. Пазней, калі вучоныя ўзяліся за больш дэталёвае даследаванне сімптаматыкі аўтызму, высветлілася, што 80—90% дзяцей з такім дыягназам маюць праблемы з сэнсорыкай. Яны адчуваюць паіншаму. Мы вось з вамі сядзім, размаўляем, нам камфортна. А дзіця, можа быць, сядзела бы на гэтым пуфе, як на іголках. Таму што яго цела давала б адчуванне не мяккасці, а дыскамфорту.

***— З Ільёй вы займаецеся ўжо другі год. Падзяліцеся вынікамі сваёй работы.***

— Калі б вы прыйшлі да мяне на заняткі год таму і зараз, думаю, убачылі б вялікую розніцу. Вось толькі адзін прыклад. Акрамя заняткаў у зале, якія пачаліся гэтым летам, мы з Ільёй ходзім у басейн. Там я таксама выкарыстоўваю прынцыпы сэнсарнай інтэграцыі. Спачатку Ілья садзіўся ў ваду ў нарукаўніках і мог хаатычна махаць рукамі. А цяпер 50-метровы басейн ён праплывае туды і назад сам, яшчэ і ныраючы пры гэтым на глыбіню два метры па прадмет, які я кідаю.

Ва ўсіх дзяцей, з якімі я працую, ёсць прагрэс. Хтосьці стаў трымаць лыжку правільней, хтосьці пачаў раўней хадзіць... Бацькі кажуць, што дзеці сталі больш спакойныя, спагадлівыя, сканцэнтраваныя.

***— Наколькі важна бацькам, акрамя заняткаў у цэнтры, самастойна займацца з дзіцем дома сэнсарнай інтэграцыяй?***

— У ідэале ўсё акружэнне дзіцяці павінна рухацца ў адным узгодненым кірунку. А сэнсарная інтэграцыя — ісці поруч з працай псіхолага прыкладнога паводзінскага аналізу *(яшчэ адзін эфектыўны метад рэабілітацыі дзетак з аўтызмам, які таксама актыўна выкарыстоўваецца ва ўсім свеце. —* **Аўт.**). Усё акружэнне дзіцяці павінна быць знаёмае з такой работай, з рэкамендацыямі спецыялістаў, з тым, што трэба прымяняць дома, у школе, на прагулцы. І вось у такім выпадку гэта залог паспяховай рэабілітацыі, у тым ліку сацыяльнай адаптацыі малечы. У адваротным выпадку гэта будуць проста выкінутыя час, грошы і сілы бацькоў, без відавочнага выніку цяпер і ў будучыні.

***— А калі ў бацькоў няма магчымасці вадзіць дзіця ў залу сэнсарнай інтэграцыі? Напрыклад, сям'я не вельмі забяспечаная або жыве ў вёсцы далёка ад Мінска?***

— Такім бацькам тым больш трэба шмат чытаць, вучыцца метадам рэабілітацыі, спосабам сэнсарнай разгрузкі, паводзінскага аналізу. Займацца дома трэба кожны дзень. Гэта важна. Я рэкамендую максімальна шмат часу праводзіць з дзіцем на прыродзе, дазваляць яму лазіць па дрэвах, турніках, вельмі важна, каб малы качаўся па траве, хадзіў басанож, катаўся на веласіпедзе, каньках, лыжах. Тэмпература, рух, падзенне, трэнне — гэта ўсё сэнсарная стымуляцыя, неабходная любому дзіцяці, а асабліва з дыягназам аўтызм.

Многія ж мамы сароміцца сваіх «маленькіх прынцаў», бо тыя могуць пры сэнсарнай перагрузцы ўчыніць істэрыку ў грамадскім месцы. Бацькі замыкаюцца ў чатырох сценах, каб лішні раз не ствараць стрэсавую сэнсарную і, як вынік, паводзінскую сітуацыю. Але гэта дэструктыўны шлях. Таму што рэальна дапамагчы дзіцяці з аўтызмам можна толькі праз інклюзію, праз паслядоўную адаптацыю яго да жыцця ў грамадстве.

У нас у цэнтры, дарэчы, ёсць спецыялісты, якія могуць падказаць бацькам, як знайсці грошы не толькі на рэабілітацыйныя заняткі для дзіцяці, але і на ўласнае навучанне. Напрыклад, дапамагчы прыцягнуць спонсарскую падтрымку пры дапамозе фандрайзінгу.

***— Якое ваша стаўленне да медыкаментознага лячэння аўтызму?***

— Цяпер у сусветнай практыцы медыкаментознае лячэнне прымяняюць у крайнім выпадку і ўсё часцей адмаўляюцца ад яго абсалютна. Бо, дзякуй богу, ужо ёсць разуменне і навуковае тлумачэнне таго, што праблема гэтым не вырашаецца. Таблеткі маскіруюць рэальны стан дзіцяці. У выніку, калі праводзіцца сэнсарная рэабілітацыя, спецыяліст працуе не з рэальнай праблемай, а з замаскіраванай. Стан дзіцяці не натуральны для яго, сфарміраваны медыкаментозным спосабам. У выніку мы можам пайсці па ілжывым следзе. Каб вынікі былі рэальнымі, важна працаваць з чыстым станам дзіцяці.

***— Як адаптаваць дзіця з аўтызмам да прафесійнага жыцця, каб яно не сядзела на шыі ў бацькоў?***

— У дзяцей з аўтызмам, як правіла, ёсць нейкая ярка выяўленая здольнасць. Часцей у матэматычных напрамках — яны любяць лічбы. Напрыклад, у Ізраілі, дзе грамадства падрыхтавана да прыняцця асаблівых людзей, гэта ўлічылі. Юнакоў і дзяўчат з сіндромам Аспергера — аднаго з відаў расстройстваў аўтычнага спектра — бяруць у войска. Яны там апрацоўваюць інфармацыю, вялікія масівы лічбаў і даных, з якімі звычайнаму чалавеку сумна працаваць. А людзям з аўтызмам, наадварот, такая праца прыносіць задавальненне.

Сярод людзей з аўтызмам вельмі шмат таленавітых IT-спецыялістаў, мастакоў, спартсменаў. Таму я заўсёды раю бацькам выкарыстоўваць захапленне свайго асаблівага дзіцяці для ўсебаковага навучання. Напрыклад, любіць хлопчык дыназаўраў. Дарослым трэба падтрымліваць гэты інтарэс. Выкарыстоўваючы цікавасць да тых жа дыназаўраў, можна вучыць яго чытаць, лічыць, вывучаць замежную мову, гуляць у футбол...

Зараз ёсць эфектыўныя метады, якія вырашаюць і паводзінскія праблемы, і сэнсарныя. Ёсць прыклады, калі дзеці з аўтызмам вучацца ў школе разам са звычайнымі дзецьмі. Сталеючы і атрымліваючы адукацыю, яны выдатна сацыялізуюцца, працуюць, як і ўсе звычайныя людзі, жывуць асобна, але абавязкова пад наглядам і пры падтрымцы псіхолагаў. Хацелася б, каб у нашай краіне былі жаданне і сілы ў бацькоў працаваць з гэтым, а ў арганізацый — разуменне і магчымасць дапамагаць ім у якасці спонсараў.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.** *nadzieja@zviazda.by*

# КАЛІ НА ДУШЫ СКРАБУЦЦА КОШКІ...

## Шукаем пазітыў у простым

**У сваёй славутай песні Эльдар Разанаў сцвярджаў, што ў прыроды няма дрэннага надвор'я. Але як жа пагадзіцца з яго словамі, калі за акном усё часцей лье дождж, а на душы пачынаюць «скрэбціся кошкі»? Пра тое, чаму мы ўпадаем у восеньскую дэпрэсію і як з ёй змагацца, распавяла псіхолаг Вольга ХАМЕНКА.**

***— Што сабой уяўляе дэпрэсія, і як распазнаць ворага ў «твар»?***

— Перш за ўсё, трэба разумець, што дэпрэсія — не слабасць характару, як лічаць многія, а цяжкі для арганізма перыяд. І ад яе, на жаль, ніхто не застрахаваны. У перакладзе з латыні дэпрэсія азначае «зацісканне». І часта — гэта падаўленне ўнутраных перажыванняў. Падобныя незавершаныя перажыванні, якія не знайшлі адпаведнага рашэння, здольныя назапашвацца і негатыўна ўздзейнічаць на чалавека. Першым крокам да таго, каб дапамагчы сабе, з'яўляецца ўсведамленне сваёй хваробы. Пры дэпрэсіі чалавек пачынае хутка стамляцца, становіцца раздражняльным. Яго апаноўваюць тужлівыя думкі, рэзкія перапады настрою, з'яўляецца адчуванне ўласнай віны і трывожнасці, ён становіцца больш змрочны. Пачынаюцца бяссонніцы, а рукі так і цягнуцца да каларыйнай ежы. Часта чалавеку нават здаецца, што ён заблытаўся ў разуменні сэнсу жыцця. І гэта далёка не ўсе сімптомы, бо дэпрэсія ўплывае не толькі на нашы думкі, пачуцці і паводзіны, але нават і на цела.

***— Як жа выбрацца з гэтай небяспечнай сітуацыі?***

— Паспрабуйце ўнесці ў сваё жыццё разнастайнасць. Халодныя восеньскія (ды і зімовыя) вечары праводзьце ў кампаніі сяброў ці сваякоў. Да таго ж гэта выдатны час для таго, каб заняцца якойнебудзь цікавай справай, на якую ў вас раней не хапала часу. Падбадзёрваюць заняткі спортам. Справіцца з прыступамі дэпрэсіі дапаможа і стары правераны метад — ароматэрапія. Напрыклад, аніс панізіць нервовасць, лаванда прыбярэ напружанне, супакоіць пасля цяжкага дня; лімон падорыць станоўчыя эмоцыі і забяспечыць прыліў энергіі, меліса дапаможа пры бяссонніцы, здыме раздражняльнасць, а мята ліквідуе трывогу. Яшчэ важна ў гэты перыяд правільна харчавацца, паколькі нервовай сістэме для правільнага функцыянавання неабходны цэлы шэраг вітамінаў, макра- і мікраэлементаў. Асабліва важныя вітаміны групы В, калій, кальцый, магній. Арганізм і так дастаткова аслаблены, таму старайцеся сачыць за тым, каб ён атрымліваў неабходныя рэчывы. Аднак калі дэпрэсія зацягнулася, і вы разумееце, што не спраўляецеся з хваробай, варта звярнуцца да псіхолага. Разам са спецыялістам вы, напэўна, зможаце знайсці ключ да вырашэння праблемы.



***— Як можна абараніць сябе ад дэпрэсіі?***

— Як бы банальна гэта ні гучала, але найважнейшую ролю ў папярэджанні дэпрэсіі адыгрывае здаровы лад жыцця: гэта і фізічная актыўнасць, і ўстрыманне ад шкодных звычак, і здаровы паўнавартасны сон. Таксама рэкамендую есці больш агародніны і садавіны, каб насыціць арганізм вітамінамі. А галоўнае — вучыцца знаходзіць пазітыўнае ў простых рэчах, бо мы бачым свет менавіта такім, якім самі хочам яго бачыць.

***ЯК ВЫ СПРАЎЛЯЕЦЕСЯ З ДРЭННЫМ ВОСЕНЬСКІМ НАСТРОЕМ? Гэтае пытанне мы задалі людзям на вуліцы.***

**Вікторыя ХАДАСОК, журналіст:**

— Часам восеньскае надвор'е выбівае мяне з каляіны, але, як правіла, ненадоўга. Звычайна ў такія перыяды стараюся як мага больш часу праводзіць з сябрамі і блізкімі, асабліва з мамай. Яна самы дарагі мне чалавек і мая падтрымка. Гэтак жа адцягвае ад сумных думак шопінг: пабегала па крамах, выдаткавала трохі энергіі і грошай, глядзіш — і настрой узняўся!

**Ірына РУДЗЬКО, настаўнік:**

— Як толькі пакрысе пачынае «накатваць», імгненна прадпрымаю якія-небудзь дзеянні. Напрыклад, пачынаю генеральную прыборку, якая мне вельмі дапамагае адарвацца ад сваіх перажыванняў. Затым спрабую знаходзіць пазітыўныя моманты ў жыцці, сустракаюся са знаёмымі. Магу адпачыць за праглядам цікавага фільма. Галоўнае, адцягнуць увагу ад сваёй праблемы і ні ў якім выпадку на ёй не зацыклівацца.

**Вольга ШЫБЕКА, маладая мама:**

— Часам я нават чакаю стрэсавых сітуацый, таму што ім заўсёды спадарожнічаюць нейкія нязвыклыя абставіны. А нешта новае дае нам вопыт і, як вынік, веды! Таму, нягледзячы на тое, што стрэсы выводзяць мяне з раўнавагі, мне ўдаецца хутка вярнуцца ў звыклы рытм жыцця. Гэта адчуванне параўнальнае са стомленасцю. Сон, ежа, вада, яшчэ пару індывідуальных рэцэптаў — і я зноў у выдатнай форме і ў добрым настроі.

**Віктар ЛАЗОЎСКІ, трэнер:**

— Я вяду здаровы лад жыцця і кожны дзень пачынаю з ранішняй прабежкі на свежым паветры. Пра дрэнны настрой і праступы нават не ўспамінаю. У кожнай пары года трэба знаходзіць свае плюсы. Напрыклад, восенню атрымліваць асалоду ад залатога ўбрання прыроды і пакрысе рыхтавацца да шматлікіх зімовых свят.

**Вольга ДУХОЎНІК**

■

■ Прэм'ера рубрыкі: «Лісты Дзеду Марозу»



# ПТУШЫНАЕ МАЛАКО ДЛЯ ВЕРЫ,

## або Верыць у цуды ніколі не позна

— Вера, пасылка табе! — увайшоўшы ў палату, прамовіла сакапяцігадовая жанчына-брунетка. У доме састарэлых яна працавала нянькай.

— Пасылка? — не верачы, перапытала Вера і адхіснулася ад акна, за якім ішоў снег: — Ад каго?

— Ад Дзеда Мароза быццам. Зірні.

Вера ўзяла ў рукі невялічкі кораб. Зірнула на подпіс. У графе «адпраўнік» сапраўды значылася імя казачнага чараўніка.

— Ну што? Табе? Ці, можа, памыліліся?

— Не памыліліся, — усміхнуўшыся, адказала Вера.

— Як? — здзівілася нянька. — Ад Дзеда Мароза звычайна дзецям падарункі прыходзяць. А ты...

— Ведаеце, Ніна Фёдараўна, верыць у цуды ніколі не позна. Вось і я пісьмо чараўніку паслала. Памятаеце, не так даўно рэклама па тэлевізары была? Запісала адрас, а потым і напісала.

— Сур'ёзна? — здзівілася нянька. — Пра што хоць пісала?

— Пра жыццё.

— Добра, — махнула рукой жанчына. — Пазней зайду, раскажаш.

— Абавязкова, — пагадзілася Вера. — Заходзьце. Пасядзім, пагутарым.

Калі нянька выйшла з пакою, Вера адкрыла пасылку. У ёй аказаўся пачак цукерак «Птушынае малако». Над ім — аркуш паперы з каляднымі віншаваннямі ад белабародага чараўніка. Жанчына ўзяла аркуш...

*«Шаноўная Вера Сяргееўна!*

*З надыходзячым Вас Новым годам і Калядамі!*

*Ваш ліст па-шчыраму ўразіў старога дзеда! Не кожны дзень даводзіцца чытаць пасланні дарослых. Што прыемна ўдвая! У навагоднія цуды верыць ніколі не позна. Асабліва людзям, якія былі пазбаўлены шчаслівага дзяцінства...»*

На вачах Веры праступілі слёзы. Яна ўспомніла радкі, якія напісала ў сваім лісце да казачнага чараўніка.

*«Шаноўны Дзед Мароз! Я нарадзілася напярэдадні вайны. У 1941-м мне было ўсяго пяць гадоў. Ты, пэўна, ведаеш, які гэта быў час для краіны? Пра лісты да Дзеда Мароза тады ніхто не думаў. Акрамя мяне ў бацькоўскім доме былі яшчэ тры дачкі-пагодкі: Таццяна, Марыля і Алена.*

*За некалькі месяцаў да вайны бацьку забралі на вучэнні. У той час вайна ішла ўжо ў Польшчы. Я памятаю, як у апошні момант ён абняў нас, затым матулю, сказаў: «Што б ні здарылася, ты толькі дзяцей пільнуй!»*

*Мы тады не ведалі, што значаць гэтыя словы. Мы не разумелі, куды ідзе бацька. Мы нічога не ведалі. Нам, канешне, было вельмі шкада і крыўдна, што бацька некуды сыходзіць. Што мы застаёмся адны з маці. Мы не здагадваліся, што ў той вечар бачылі яго апошні раз...»*

Вера перавяла позірк на акно. За ім працягваў ісці снег. Потым яна зазірнула ў тумбачку. Сярод рэчаў знайшла паперу з школьнага сшытка. Гэта быў чарнавы ліст будучага пісьма Дзеду Марозу. Яна прабегла напісанае вачыма. Потым вярнулася назад, знайшла момант, на якім перарвалiся яе ўспаміны.

*«Наша вёсачка была невялікая. Немцы часам наведваліся — шукалі партызан. Але тых хаваліся ў лясах бліжэй да райцэнтра. Так мы і жылі два гады. У 1943-м наш куточак вызвалілі чырвонаармейцы. Гэта было вялікае свята для ўсіх нас.*

*Ужо ў наступным годзе мы змаглі пайсці ў школу.*

*Пасля вайны пачалі вяртацца дамоў мужчыны. Мы таксама чакалі свайго бацьку. А яго ўсё не было. Потым, пазней, у ваенкамаце маці сказалі, што ён знік. Гэта давала надзею. Але...*

*Гады ішлі. Бацькі так і не дачакаліся. Мы — чатыры сястры — выраслі. Паехалі ў горад. Я — апошняя. Мне хацелася стаць настаўніцай, вучыць дзяцей. Таму паступіла ў педагагічнае вучылішча на настаўніцу пачатковых класаў.*

*Памятаю, аднойчы пад Новы год у інтэрнаце засталіся пяць дзяўчат. Астатнія паехалі сустракаць свята дадому. Стыпендыя ў нас была не сказаць што вялікая. Але адзначыць свята хацелася вельмі. Сабраліся мы ды і пашлі ў бліжнія крамы горада.*

*На дэсерт набылі надзвычай папулярныя цукеркі «Птушынае малако». Торт з такой назвай на той час яшчэ не выраблялі. А да іх — не менш папулярны напітак «Тархун». Ну і, канешне, прыгатавалі ўсім добра вядомыя традыцыйныя стравы — наварылі бульбы, зрабілі селядзец пад футрам...*

*Так і сустрэлі пачатак наступнага года за каробкай цукерак. А колькі было дзявочых размоў! І планы на будучыню. Прафесійныя — здзейсніліся. Пасля заканчэння вучобы я ўсё жыццё адпрацавала педагогам. Маю шмат узнагарод. А вось замуж так і не выйшла. І пад канец жыцця, застаўшыся адна, апынулася ў доме састарэлых.*

*Не так даўно ў палаце са мной была яшчэ адна жанчына. Але зусім нядаўна яе не стала.... І я ў пакоі пакуль адна.*

*Дзед Мароз, я ведаю, што ты існуеш. Даруй, што не пісала табе лісты ў дзяцінстве. Як ты ўжо зразумеў, я не магла... А цяпер я расказала табе ўсю сваю гісторыю жыцця.*

*Ніхто не ведае, колькі нам засталося жыць. Асабліва мне, старому чалавеку, які размяняў восьмы дзясятак. Але сустракаючы Новы год, новыя надзеі, мне вельмі хацелася ўспомніць мінулае юнацтва. Каб зноў на стале ў такое свята быў пачак «Птушынага малака». І маім госцем быў той, каго так чакаюць усе дзеці Зямлі. І каго ніколі ў сваім дзяцінстве не бачыла я...»*

На гэтым яе ліст завяршыўся. Але яшчэ былі і другі — ад Дзеда Мароза. Яна ўзяла яго ў рукі.

*«Вера Сяргееўна, я — чараўнік навагодняга свята — абавязкова зазірну да Вас. Мы пасядзім за гарбатай і вашымі любімымі цукеркамі, пагутарым. Вы загадаеце сваё самае патаемнае жаданне. Гэтая сустрэча адбудзецца вельмі хутка. Я ведаю, што не паспееце вы дачытаць гэты ліст да апошняй кропкі, як у вашае жыццё прыйдзе казка навагодніх дзён».*

Міжвольна Вера зноў зірнула ў акно. Па сцяжынцы, якая вяла ва ўстанову, павольна крочылі Дзед Мароз і Снягурка. У пакой зазірнула нянька.

— Ну што там з пасылкай? Не падмануў Дзед Мароз? — запыталася яна.

Вера ўсміхнулася.

— Не, Ніна Фёдараўна, не падмануў. І накіроўваецца да нас.

— Няўжо? — не паверыла нянька.

— А вы самі зірніце ў акно, — прапанавала Вера.

Нянька недаверліва паглядзела праз шыбу.

— Бацюхны, — прамовіла яна. — Ён самы. І Снягурка. Што рабіць будзем?

— Ставіць гарбату і сустракаць гасцей, — усміхнулася жанчына.

**Андрэй СІДАРЭЙКА**

■

# «БАРБАРА І ЭДУАРДА»...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Раскажыце, як вы трапілі ў нашу краіну?***

**Эдуарда:** — Раней мы абое жылі на Кубе, але, можна сказаць, нават не перасякаліся. Я працаваў радыёвядучым, а Барбара была вядомай спявачкай. Наша жыццё ішло сваім парадкам, і мы нават не здагадваліся, што некалі станем мужам і жонкай, а тым больш, пераедзем у Беларусь. Наш лёс змяніў «Славянскі базар у Віцебску» ў 2012 годзе. Барбару запрасілі выступаць, я таксама прысутнічаў на гэтым мерапрыемстве. На «Славянскім базары» мы бліжэй пазнаёміліся, паміж намі прабегла, як у вас кажуць, іскра. Пасля заканчэння «Славянскага базару» Барбары прапанавалі працу ў Беларусі. Шчыра кажучы, мы не доўга думалі, як паступіць. Рашэнне прыйшло неяк само. Мы вырашылі застацца ў Беларусі, застацца разам.

***— Як узнік ваш дуэт? Барбара ж заўсёды была сольнай спявачкай...***

**Эдуарда:** — Мы вырашылі паспрабаваць. Пасля першага агульнага выступлення эмоцыі людзей былі неймаверныя! Думаю, ім падабалася, што я — чорны, а Барбара — светлая. Гэта эфектна глядзіцца *(смяецца)*. Нам так спадабалася працаваць у дуэце, што мы выступаем так дагэтуль. Акрамя творчага дуэта праз пару гадоў стварылі сямейны. Абвянчаліся мы ў мінскім Чырвоным касцёле і згулялі вяселле 11 мая 2013 года.

***— Як вам было на першым часе ў Беларусі? Адобрылі блізкія ваш выбар?***

**Эдуарда:** — У нас не было тут ні сяброў, ні знаёмых. Толькі людзі, якія працавалі з Барбарай. Яшчэ адной праблемай для нас стала тое, што ніхто не ведаў нашай мовы. А мы не ведалі рускай, часта даводзілася тлумачыць жэстамі. Што датычыцца родных, яны ўхвалілі наша рашэнне. Спачатку не маглі зразумець, як так: адны ў чужой краіне? Але супраць ніхто не быў. Яны нам казалі: «У Беларусі прыгожа! Паспрабуйце, усяго адзін раз жывём».

***— Якія эмоцыі ў вас выклікала краіна? Што новага і нечаканага для сябе вы ўбачылі?***

**Эдуарда:** — Першае, што нас уразіла, гэта цягнікі. Мы ніколі на іх не ездзілі. А на «Славянскі базар» у Віцебск дабіраліся менавіта так. Яшчэ для нас было нязвыклым надвор'е. На Кубе заўсёды горача, а ў Беларусі надвор'е бывае рознае. Калі мы прыехалі, было лета, вельмі горача, дзесьці 33 градусы. А вось зіма надышла вельмі нечакана. Мы добра памятаем гэты дзень. Крочым з метро на «Каменнай Горцы» і, як толькі выйшлі, убачылі снег. У нас на Кубе ніколі не было снегу. Барбара адразу ж пачала проста крычаць ад шчасця і здзіўлення.

**Барбара:** — У самой Беларусі ўсюды прыгожа і спакойна. А яшчэ людзі вельмі ціхія. На Кубе заўсёды гучна, ні хвілінкі спакою. Аднойчы мы былі ў Расіі, але нам там не спадабалася, бо, як ні дзіўна, для нас там было занадта шумна. Усе суседзі ў руху, кудысьці спяшаюцца.



***— Многія лічаць, што ў гарачых краінах вельмі шмат музыкі, а дакладней, вулічных музыкаў. Скажыце, ці так гэта?***

**Барбара:** — У нас артысты выступаюць у барах, рэстаранах, тэатрах, на адкрытым паветры. Але Куба не тая краіна, дзе вы будзеце ісці па вуліцы і пачуеце вулічных музыкаў.

***— Чаму вы вырашылі жыць не ў Мінску, а ў вёсцы?***

**Эдуарда:** — Раней мы здымалі кватэру ў сталіцы, але потым падумалі і вырашылі не выкідваць грошы на вецер, а набыць свой дом. Выбіралі паміж двума гарадамі: Слуцкам і Салігорскам, бо яны нам вельмі спадабаліся. У выніку спыніліся на доме ў Валошаве. Хата ў нас дастаткова ўтульная, і нам яна вельмі падабаецца.

***— А як адрэагавалі на вас вашы новыя суседзі?***

**Барбара:** — Спачатку яны не разумелі, хто мы такія і адкуль узяліся, мусіць, пабойваліся нас. Але потым мы хутка знайшлі агульную мову. Яны дапамагалі нам ва ўсім. Расказвалі пра традыцыйную кухню, звычаі Беларусі. Яшчэ, што нас здзівіла, суседзі прынеслі нам мноства гасцінцаў. Мноства закатак — агуркі, памідоры, розныя віды варэння. Хтосьці з суседзяў прынёс нам цэлы мех бульбы, іншыя пачаставалі морквай і капустай.

***— У вас ёсць агарод. Гэта звычка з роднай краіны ці новае адкрыццё?***



**Эдуарда:** — Для нас гэта новае, я нават сказаў бы, нешта нязведанае. На Кубе агародамі займаюцца толькі пажылыя людзі. Вы нідзе не ўбачыце ў нас маладых людзей, якія працуюць на агародзе. Цяпер у нас ёсць свой агародзік. Паколькі мы займаліся ім першы раз, нам дапамагалі нашы суседзі. Яны вучылі, як і што правільна вырошчваць. Цяпер у нас на агародзе растуць памідоры, агуркі і, вядома ж, бульба.

***— Як часта вы падарожнічаеце? Ці наведваеце радзіму? Якія сувеніры прывозіце сваякам?***

**Эдуарда:** — Кожны месяц мы вандруем па Еўропе. Ездзім у Літву, Іспанію. Увогуле, у нас вельмі шмат гастроляў. Бывае, ездзім на Кубу. А прывозім сваякам вельмі шмат розных рэчаў. Галоўным сувенірам з'яўляецца... ежа. На першым месцы — бульба. На Кубе яе вельмі мала, для мясцовых жыхароў яна як далікатэс. Яе прывозяць у крамы ўсяго некалькі дзён, выстройваецца проста вялізная чарга. Наступны «далікатэс» — гэта маянэз. На Кубе ўсяго адзін яго від, і таму, калі мы прыйшлі ў беларускія





крамы і ўбачылі вялікі выбар, былі моцна здзіўлены.

***— Для свайго задавальнення вы слухаеце той самы жанр музыкі, што і выконваеце? Ці, можа, спалучаеце рускую, беларускую музыку?***

**Барбара:** — У вольны час мы слухаем розную музыку. Рускую часцей за ўсё — па радыё. У нас любімая руская песня «Развітацца» гурта «Уматурман» і беларуская «Касіў Ясь канюшыну». Зараз часта спяваем беларускія і рускія песні. На самай справе ў нас ёсць мара прадставіць Беларусь на конкурсе «Еўрабачанне».

***— Часта прымаеце гасцей? Ці любіце шумныя кампаніі?***

**Барбара:** — Вельмі любім гасцей! Яны нам расказваюць пра беларускія традыцыі, пра нацыянальную кухню. Наогул, заўважылі, што на Кубе і ў Беларусі вельмі гасцінныя людзі. Мы заўсёды гатовыя для новых знаёмстваў.

**Ангеліна НОВІКАВА.**

---

■ Падарожнік

# «Трэба збіраць уражанні, а не рэчы»

**Падарожжы — добрая магчымасць пазнаёміцца з новымі краінамі, іх культурай і традыцыямі, асаблівасцямі менталітэту мясцовых жыхароў. Але ці часта мы падарожнічаем па роднай Беларусі? Дапытлівы вандроўнік Фелікс КОРКУЦ з упэўненасцю адказвае: «Так».**

Сваё дзяцінства ён правёў у Нароўлі, дзе і з'явілася цікавасць да прыроды. Падлеткам марыў падарожнічаць, чытаў шмат кніг па гісторыі і геаграфіі (з таго часу і па сёння ў Фелікса Станіслававіча дома вялікая бібліятэка). Яны дапамаглі атрымаць грунтоўныя веды, якія спатрэбіліся ў далейшым жыцці і прафесіі.

Сёння Фелікс Станіслававіч — дырэктар Акцябрскага лясгаса, у якім ён працуе з часу пераезду пасля Чарнобыльскай катастрофы. Падарожжа па кнігах сураэмоўнік перанёс у жыццё: яму вельмі часта па рабоце прадстаўляецца магчымасць наведваць розныя куткі Беларусі, бліжняга замежжа.

Але вандруе галоўны ляснік раёна не толькі па абавязку працы, але і па натхненні душы, разам са сваёй сям'ёй. «Лягчэй назваць мясціны Беларусі, дзе я не быў, чым тыя, дзе быў. Жонка Вольга, дачка Аліна і сын Кірыл спачатку неахвотна згаджаліся на мае прапановы, яны не разумелі, навошта. Потым вандроўкі сталі нормай нашага жыцця. Я перадаю блізкім свае светаадчуванне. У любы момант мы вызначаем маршрут на карце, збіраемся за паўгадзіны і едзем. Так цікавей», — гаворыць Фелікс Станіслававіч. Дарэчы, карта для нашага героя — не проста паказальнік маршруту, гэта яшчэ адно асобнае хобі. Бацька да таго добра і ўдала заклаў веды аб прыродзе, любоў да навакольнага свету і прагу пазнання дачцэ Аліне, што ўжо два гады яна студэнтка



Каля Касоўскага замка ў Івацэвіцкім раёне.

БДЭУ, вучыцца ў Вышэйшай школе турызму, а жонка Вольга змяніла род дзейнасці — працуе ў кветкавай краме і сама вырошчвае расліны. Сын Кірыл яшчэ вучыцца ў школе, але таксама цікавіцца геаграфіяй і гісторыяй роднага краю.

Пры знаёмстве з домам сям'і вандроўнікаў адразу ж заўважаеш безліч фотаальбомаў. «Лічу, што трэба збіраць уражанні і эмоцыі, а не рэчы. Першапачаткова з паездак мы прывозілі талерачкі, манеткі і іншыя адметныя прадметы. Але своечасова заўважылі, што пакояў дома не хопіць, каб іх расставіць па паліцах. Таму абмяжоўваемся турыстычнымі картамі (без іх нікуды) і талеркамі з незвычайным малюнкам».

Зараз многія беларусы імкнуцца выехаць за межы краіны, бо там «лепшы свет». Але Фелікс Станіслававіч так не лічыць, і можа кожнаму паказаць і расказаць пра нязведаныя мясціны Беларусі, збудаванні, якім не сорамна было б стаяць у цэнтры Парыжа або Рыма.

«Падарожжы — не проста забавы. Праз іх чалавек развіваецца, пазнае невядомае, заглядвае ў таямніцы гісторыі. Праблема ў тым, што для людзей славутасці Беларусі — гэта толькі Нясвіжскі і Мірскі замкі або Белавежская пушча. Не люблю, калі кажуць, маўляў, у нашых мясцінах няма чаго паглядзець. Для пачатку трэба хоць бы разгарнуць турыстычную карту і выйсці з дому. Тым больш зараз ёсць інтэрнэт. Галоўнае — ведаць, што шукаць. На жаль, людзьмі часта рухае лянота, гэта самае пагібельнае. А для мяне падарожжа па краіне — асалода. Калі ездзіш па маленькіх вёсачках, бачыш нашу сапраўдную беларускую архітэктуру і культуру. І яна кардынальна адрозніваецца ад рускай, літоўскай, украінскай і іншых. Вельмі прыгожая і велічная. Звычайна самае прыгожае знаходзіцца ў маланаселеных або ўжо «памерлых» вёсках. З сям'ёй мы едзем туды і за два дні паспяваем усё паглядзець, а калі не — затрымліваемся на тыдзень. Так для нас адкрыліся Дуга Струвэ, Крэўскі замак, замак Гальшанскі, палац Сапегаў і г. д. Многія думаюць, што для падарожжа трэба мець шмат грошай. Гэта не так. Дастаткова жадання і ведаў».

**Дар'я ШЛАПАКОВА**

■ Жаночае шчасце

# АДЗІН — І НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ

## Шматдзетная сям'я з Ясеня пра тое, чаму не прамяняе вёску на горад

**Аграгарадок Ясень наогул багаты на маладыя сем'і. Прычым, што асабліва прыемна, шматдзетныя. І калі з іншых вёсак моладзь бяжыць у горад, то тут як раз наадварот. Магіляўчанка Ларыса Дубінчык у сярэдзіне 90-х прыехала ў Ясень, каб адпрацаваць пасля ўніверсітэта два гады, але засталася на ўсё жыццё. І ні кропелькі не шкадуе.**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

### Хадзіў да рэпетытара, а знайшоў жонку

Гэта цяпер яна дакладна ведае, што лёс спецыяльна накіраваў яе сюды, каб сустрэць сваю палавінку. А тады маладзенькая выпускніца магілёўскага МДУ імя А. Куляшова марыла толькі аб адным: каб быць бліжэй да дома і клапаціцца пра сваіх не вельмі моцных на здароўе бацькоў. У Магілёў да іх ездзіла кожны выхадны дзень. І раптоўна стала звяртаць увагу на статнага прыгажуна ў міліцэйскай форме, які часта трапляў ёй на вочы на гэтым жа паўстанку. Спачатку яны проста пераглядаліся, потым пачалі ўсміхацца адно аднаму. Магчыма, іх адносіны засталіся б на гэтым узроўні, калі б не выпадак.

— Я жыла на здымнай кватэры разам з яшчэ адной настаўніцай — па рускай мове, і аднойчы на парозе з'явіўся ён, — усміхаецца Ларыса. — Як потым аказалася, Аляксандр вырашыў падцягнуць свае веды па рускай, каб паступіць у тэхнікум. Мая калега пагадзілася дапамагчы. Ён пад яе кіраўніцтвам пісаў дыктоўкі, а потым мы ўтраіх пілі гарбату. Непрыкметна дыктоўкі адышлі на другі план, і пачаліся нашы рамантычныя сустрэчы. Да чыгуначнай станцыі, дзе ён жыў, было каля 4 кіламетраў, але на спатканні, сцвярджае мой сённяшні муж, нават не хадзіў — бегаў. Пасядзім, пагаворым, пагуляем па вёсцы, і ён зноў бяжыць дахаты. Ніякае надвор'е — дождж, снег, вецер — не перашкаджала нашым сустрэчам. Кожны свой выхадны ён быў у мяне. Аляксандр вельмі сціплы, сарамлівы, нават прапанову стварыць сям'ю першай агучыла я. А яшчэ быў момант, калі мы за некалькі тыдняў да вяселля сур'ёзна пасварыліся. Разгубленасць, адчай, крыўда — эмоцыі перапаўнялі мяне. Але калі ён праз некалькі гадзін прыйшоў прасіць прабачэння, я ўсё яму даравала. І ні разу не пашкадавала аб гэтым за 17 гадоў сумеснага жыцця.

### Бабулін пярсцёнак

Жыццёвай мудрасці Ларысу навучыла бабуля. Яе рана выдалі замуж — у 16 гадоў, за мужчыну, якога яна не ведала. І яны пражылі разам усё сваё жыццё. Не было нават думкі развесціся або паскардзіцца. На памяць ад яе ўнучцы застаўся шыкоўны пярсцёнак. «Ручная работа, — круціць у руках залатую рэч Ларыса. — Мне яго матуля перадала, а я аддам старэйшай дачцэ — Ганне. Бо перадаецца ён выключна па жаночай лініі. Гісторыя яго з'яўлення ў сям'і, на жаль, невядомая. Дзядуля, напэўна, вельмі кахаў сваю жонку, калі купіў такую дарагую рэч. Яна каштавала аж 33 рублі — вялікія грошы па тых часах. А жылі яны вельмі сціпла. І бабуля выразшыла, што пярсцёнак стане абярэгам для будучых пакаленняў. Цяпер вось ужо і маёй маці няма, а памяць засталася».

— Сям'я — гэта самае важнае ў жыцці любога чалавека, — лічыць Ларыса. — Мяне вучылі, што муж — гэта той чалавек, з якім ты павінна быць і ў горы, і ў радасці. Мае бацькі — прыклад самаахвярнай любві. Калі маці хварэла, тата гадамі яе дагледжаў, нават не думаў пра развод. І гэтую рысу яны нам з братам перадалі. Нават калі вельмі цяжка, трэба трымацца адно аднаго.

Мае бабуля з дзядулем жылі па-рознаму, але выхавалі пяцярых дзяцей. Траіх з іх страцілі ў гады вайны. Шмат гора пабачылі, але заўсёды заставаліся разам. Бабуля была вельмі веруючая жанчына, ведала шмат замоў. Дзіця дрэнна спіць — трэба пачытаць малітву ад спалоху, ад сурокаў. Сама бабуля малілася за здароўе кожнага члена сям'і, пералічвала ўсіх па імёнах. Я, калі начавала ў яе, чула гэтыя гарачыя малітвы. А ў маёй маці была цёплая рука, калі яна нас з братам лячыла. Мы рэальна адчувалі гэту гаючую энергію.



### «Мама — артыстка, у таты — залатыя рукі»

У Ларысы і Аляксандра трое дзетак — пятнаццацігадовая Ганна, дванаццацігадовы Юрый і трохгадовая Волечка. Дзяўчынка адразу ж прынесла нам скрыню з цацкамі: «Паглядзіце, што мне тата падарыў!» Ганна паказала свае малюнкі. У яе пакойчыку яны ўсюды — на сценах, у сшытках, альбомах. Часта сяброўкі просяць намаляваць якуюнебудзь знакамітасць. І яна ім не адмаўляе. А яшчэ вышывае і іграе на гітары. Юру больш падабаецца нешта выпальваць на фанеры, нават у гурток запісаўся. Паралельна таксама займаецца музыкай, іграе на баяне і акардэоне. Волечка пакуль не вызначылася з хобі, але любіць танцаваць і іграць на цацачным сінтэзатары. Творчыя схільнасці ў дзецях ад маці. Яна закончыла школу з мастацка-архітэктурным ухілам, а яшчэ з 6 да 20 гадоў сур'ёзна займалася танцамі. Ёсць нават дыпломы і граматы. На адным з фота, дзе яна ў балетнай пачцы, так і напісана — Ларыска-артыстка. У Ясені ўсе гэтыя веды спатрэбіліся. Адзін час шматдзетная маці нават вяла гурток танцаў у вясковай школе. Яна іх ведае шмат, у тым ліку беларускіх. Можа запаліць «Лявоніху» або станцаваць «Бульбу».



— Усе святы адзначаем толькі дома, стараемся нікуды не хадзіць, да сябе ў госці запрашаем, — кажа Ларыса. — Дзецям расказваем пра сваіх бабуль і дзядуль, пра нас. Некалькі гадоў таму, калі ў нас толькі нарадзілася Волечка, знялі відэаролік на конкурс «Найлепшая сям'я».

Пра вялікую сям'ю Ларыса марыла яшчэ ў юнацтве. І з мужам адразу ж вызначыліся, што дзяцей у іх будзе столькі, колькі бог дасць. Таму, калі ў 36 гадоў зацяжарыла Волечкай, нават не сумнявалася — нараджаць!

Раней у сям'і была двухпакаёвая кватэра — асабліва не разгорнешся. Але памянялі яе на дом і цяпер не нарадуюцца. Ёсць дзе і пагуляць, і сілы прыкласці. У Аляксандра наогул залатыя рукі. Вунь пад вокнамі пабудаваў шыкоўную пясочніцу, зараз збіраецца змайстраваць горку, зрабіць для сына турнік. Тэрыторыя вакол дома ўвогуле накшталт клуба па інтарэсах. Асноўную частку займае вялікі газон, дзе ёсць месца для дзіцячых гульняў і заняткаў спортам. Ёсць і градкі. Але не зусім звычайныя, у выглядзе вялікіх скрынь, дзе растуць перац, агуркі, памідоры, кроп і шмат чаго іншага карыснага.

— Пакуль іх 9, плануем яшчэ некалькі зрабіць, — удакладняе Ларыса. — Зручна накрываць, падвязваць, апрацоўваць ураджай, ды і бруд у дом на нагах не носіш. Стратэгічны запас з кансерваваных дароў прыроды ўжо чакае свайго часу. На палічках у кладоўцы можна знайсці нават варэнне з барбарысу. І цэлая батарэя слоікаў з агуркамі-памідорамі і бярозавым сокам.

— У вёсцы жыць адно задавальненне, — кажуць Ларыса з Аляксандрам. — Шмат моладзі, у кожнай сям'і па 3—5 дзяцей. Мерапрыемствы наведваем. Сельскі клуб недалёка. Тут усё побач.

Ганна запэўнівае, што ў яе тут агітбрыгада яшчэ тая. Сваіх аднагодкаў хапае, плюс прыязджаюць з горада на выхадныя. Разам гуляюць у валейбол або шпацыруюць па вёсцы вясёлай кампаніяй.

— Летам я хаджу з сябрамі на рэчку, — падхоплівае размову Юра. — Або можна каля дома з мячом пагуляць.

— У нас моладзь не сумуе, у клубе спяваем, танцуем, — кажа Ларыса. — Тут весела. У горад не хочацца зусім. Там мітусня, машыны. — Дамоў прыязджаеш і радуешся — раздолле!

— Пераязджаць у горад нават не думаем, — запэўнівае Аляксандр. — Навошта? Каб жыць у інтэрнаце і на ўсё скардзіцца? Мы тут аселі канкрэтна і не збіраемся нікуды з'язджаць.

Дарэчы, наш візіт супаў з днём нараджэння гаспадара семейства. І Аляксандру было асабліва прыемна, што ў такі важны для яго момант сям'ю наведала звяздоўская «Сямейная газета».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Фотаздымак з гісторыяй

# «КАБ ТОЛЬКІ НЕ БЫЛО ВАЙНЫ...»


У Берліне, 1945 год.

**Дасылаю вам фотаздымкі, якія наша сям'я вельмі шануе і захоўвае. Менавіта дзякуючы ім я бліжэй пазнаёміўся са сваім прапрадзядулем. Яго звалі Пётр Фёдаравіч Чаўлытка. Сёлета яму магло б споўніцца 115 гадоў...**

Прапрадзядуля браў удзел у польскай ды Вялікай Айчыннай войнах. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі» за тое, што пры фарсіраванні ракі Одэр (Германія) знаходзіўся на прамой наводцы артылерыйскай зброі ў складзе разліку і знішчыў два кулямётныя гнёзды.

З вайны вярнуўся на радзіму толькі зімой 1946 года. Доўгі час працаваў у калгасе на Вілейшчыне. Вельмі шмат расказваў пра сваё жыццё майму прадзядулю, той — свайму сыну Мікалаю. У баях за Берлін Пётр Фёдаравіч атрымаў раненні — у плячо і ў нагу. Доўгі час ляжаў у шпіталі, ледзь застаўся жывы. Было вельмі цяжка, галодна і холадна. Расказваючы пра гэта, ён заўсёды плакаў. Складана яму было гаварыць пра вайну. Пётр Фёдаравіч паўтараў на працягу ўсяго жыцця: «Каб толькі не было вайны, хай заўсёды будзе над намі мірнае неба».


Пётр Чаўлытка (першы злева) разам з сябрамі (1938 год).

Памёр прапрадзядуля ва ўзросце 82 гадоў, пакінуўшы пасля сябе не толькі добрую памяць, але і пяцярых дзяцей: Ніну, Марыю, Яўгенію, Лідзію ды Мікалая.

**Уладзіслаў ГАТОЎКА, вучань 8 «А» класа СШ №3 г. Вілейкі.**

| Сведения о предмете электронных торгов | Автомобиль легковой УАЗ 3909, г. в. 2001, г. н. AI 4687-5 |
| Начальная цена предмета торгов | 2184,00 белорусских рублей, без НДС |
| Шаг аукциона | 5% – 109,20 белорусских рублей |
| Сумма задатка | 10% – 218,40 белорусских рублей |
| Возмещение победителем аукциона расходов, связанных с организацией торгов | 49,92 белорусских рублей |
| Местонахождение предмета торгов | г. Дзержинск, 1-я Ленинская улица, 1 |
| Р/с для перечисления суммы задатка | BY84AKBB36420000002880000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код (БИК) – AKBBBY2X, УНП 600013502, получатель – ГУЮ Миноблисполкома |

| Лот № | 52 |
|---|---|
| Сведения о предмете электронных торгов | Автобус грузовой ГАЗ 5312, г. в. 1986, г. н. ОЕ 3196-5 |
| Начальная цена предмета торгов | 1952,00 белорусских рублей, без НДС |
| Шаг аукциона | 5% – 97,60 белорусских рублей |
| Сумма задатка | 10% – 195,20 белорусских рублей |
| Возмещение победителем аукциона расходов, связанных с организацией торгов | 49,92 белорусских рублей |
| Местонахождение предмета торгов | г. Дзержинск, 1-я Ленинская улица, 1 |
| Р/с для перечисления суммы задатка | BY84AKBB36420000002880000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код (БИК) – AKBBBY2X, УНП 600013502, получатель – ГУЮ Миноблисполкома |

Торги в электронной форме в процедуре исполнительного производства (далее – электронные торги) будут проведены 17.11.2017 г. в 10.00, на электронной торговой площадке ALLTRADES.BY, окончание – 17.11.2017 г. в 17.00. Дополнительную информацию по участию в электронных торгах можно получить по тел.: (8 029) 392 95 50, (8 029) 659 71 63, ALLTRADES.BY.

Дополнительную информацию по лоту – должник ОАО «Дзержинский райагросервис», контактное лицо – Дворецкий Александр Иванович, тел. (8 029) 648-28-11.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в электронных торгах указан в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора электронных торгов ООО «БизнесИнвестИнжиниринг» – ALLTRADES.BY. Заявление (регистрация) на участие, необходимые документы и задаток в размере 10% по лоту принимаются по 16.11.2017 г.

■ Беларусікі

# НА БАБУЛІНЫМ ВОСТРАВЕ



Гэты фотаздымачак на конкурс даслала бабуля дзяўчынкі. «Мая ўнучка Велясніцкая Варвара жыве ў Лунінцы Брэсцкай вобласці. Ёй 6 гадоў. Варвара вельмі добрая і ласкавая дзяўчынка, любіць спяваць і танцаваць. Чытае на памяць беларускія вершы. А яшчэ любіць адпачываць у мяне на вёсцы Востраў разам з сястрычкай Ксеніяй».

***Шаноўныя мамы і таты, бабулі і дзядулі! Шчыра запрашаем вас прыняць удзел у конкурсе «Беларусікі». Дасылайце здымкі вашых дзетак, унукаў, а можа, нават і праўнукаў (з невялічкім апаведам) на адрас «Звязды». Але адна ўмова — каб, зірнуўшы на фота, адразу ж можна было зразумець, што гэта беларусік. Арыгінальнасць і творчы падыход вітаюцца! Аднаго з герояў, якога мы ўбачым на здымках, чакае прыз!***

Сямейная пошта

# СПЕЦЫЯ-ЛЕКАР,

## або Крыху сонейка на вашым стале

**Далёка не кожная гаспадыня выкарыстоўвае для прыгатавання ежы куркуму. Апошняя, тым не менш, заслугоўвае таго, каб заняць пачэснае месца на палічцы с прыправамі. «Візітоўка» гэтай спецыі — яе насычаны жоўты колер, абумоўлены наяўнасцю ў карэнішчах і сцёблах вялікай колькасці жоўтага фарбавальніка куркуміну.**

Вучоныя высветлілі, што куркума з'яўляецца прыродным імунамадулятарам, або, кажучы простымі словамі, дапамагае захоўваць імунітэт у належным стане. Даследаванні паказалі і тое, што біялагічна актыўны кампанент куркумін не толькі памяншае запаленчыя працэсы ў арганізме чалавека, але і спрыяе нармалізацыі ўзроўню цукру ў крыві, валодае антыканцэрагеннымі ўласцівасцямі. Жыхары Паўднёва-Усходняй Азіі, а таксама Індыі, якая з'яўляецца адным з найбуйнейшых вытворцаў куркумы, спрадвеку выкарыстоўвалі гэтую культуру для лячэння хвароб страўніка, захворванняў верхніх дыхальных шляхоў. Раствор куркумы ўжывалі для паласкання ротавай поласці, каб пазбавіцца ад запалення дзяснаў. Гістарычныя даныя сведчаць пра тое, што «азіятка» куркума была даволі вядомая і на тэрыторыі ВКЛ. Дарэчы, гэтая спецыя з'яўляецца адным з інградыентаў знакамітага напою крупнік, які вельмі шанавала тагачасная шляхта. Уяўляе ён сабой нешта накшталт лікёру на аснове мёду, зёлак і розных спецый. Менавіта куркума ў спалучэнні з іншымі раслiннымі кампанентамі надавала крупніку ўнікальныя залацісты колер і дабаўляла сваю, непаўторную нотку ў ягоны цёплы зёлкавы пах. Але ж вернемся ў нашы часы і адзначым, што хоць ніводная з раслін не можа быць панацэяй ад раку ці іншай хваробы, многія з іх, у тым ліку куркума, у стане дапамагчы чалавеку ў захаванні здароўя.

Ужываць куркуму можна не толькі для прыгатавання мясных страў. Доб-



ра дадаць яе і ў цеста для бліноў, і ў суп, і ў ваду, дзе варыцца бульба, з якой вы надумалі зрабіць пюрэ. Вядома ж, дабаўляць куркуму трэба зусім у невялікай — на кончыку ляза нажа — колькасці, бо тут, як у медыцыне, галоўны прынцып — «не нашкодзь». Тады смак у стравы будзе прыемны, без лішняй гарчынкі, а колер таго ж супчыку ці пюрэ набудзе цудоўнае сонечнае адценне. :)

**Наталля РУЖЫЦКАЯ.**

■ Далучайцеся!

# ЦАЦКА НА ЁЛКУ... СВАІМІ РУКАМІ

**Ужо чацвёрты год запар Вялікі тэатр Беларусі запрашае дзяцей і іх бацькоў прыняць удзел у сямейным конкурсе — «Навагодняя тэатральная цацка».**



Фота Наталлі БАГРАЦОВАЙ.

«Гэта не проста конкурс, — кажа **вядучы рэдактар службы маркетынгу, інфармацыі і рэкламы Вялікага тэатра Алена БАЛАБАНОВІЧ,** — але яшчэ і цудоўная нагода чарговы раз сабрацца дома ўсёй сям'ёй — пагутарыць, пафантазіраваць, пасмяяцца — і ў выніку стварыць цікавую цацку. Вядома, яна павінна адпавядаць тэме і быць тэатральнай, нейкім чынам намякаць на той ці іншы спектакль або быць звязанай з жыццём акцёра ці музыканта».

З палётам фантазіі ў нашых дзяцей праблем няма. Летась я ў гэтым пераканалася на ўласныя вочы. Дзясяткі сем'яў з самых розных куткоў Беларусі літаральна засыпалі тэатр сапраўды незвычайнымі цацкамі. Каго там толькі не было — Шчаўкунок і Папялушка, Кармэн і Жар-птушка, Айбаліт і Мышыны кароль, Сіньёр Памідор і Тры парасяці, Мадам Батэрфляй, Шэхеразада і нават Рыгалета. Здаецца, тут можна было ўбачыць любога героя спектакля Вялікага тэатра Беларусі! І ўсе яны, адчувалася, былі зроблены з любоўю.

Менавіта гэтая цеплыня такая неабходная дзецям дапаможнай школы-інтэрната №10 горада Мінска, над якой Вялікі тэатр узяў шэфства. Як і ў мінулыя гады, цацкі, дасланыя на конкурс, адправяцца да іх. Але перш яны ўпрыгожаць галоўную ёлку Вялікага тэатра. Пераможцы, аўтары найлепшых (на думку журы) тварэнняў, вядома, не застануцца без заслужаных узнагарод. Больш за тое, паводле слоў арганізатараў, ні адно дзіця не пойдзе з тэатра без падарунка: абавязкова будуць уручаца заахвочвальныя прызы, дыпломы ўдзельнікаў, а таксама сувеніры ад спонсараў конкурсу.

Такім чынам, можаце ўжо пачынаць думаць, раіцца з бацькамі, прымаць дапамогу ад бабуль і дзядуль, настаўнікаў і выхавальнікаў — час яшчэ ёсць. Прыдуманыя і створаныя вамі цацкі Вялікі тэатр Беларусі прымае з 1 па 22 снежня.

Цацкі можна прынесці ў тэатр самім (1-ы, 7-ы пад'езды, службовы ўваход (пакінуць у аховы)). Або даслаць на адрас: 220029 г. Мінск, пл. Парыжскай Камуны, 1, Вялікі тэатр Беларусі. У гэтым выпадку абавязкова добра ўпакуйце сваё тварэнне! Кожная цацка павінна быць падпісана (назва цацкі, прозвішча сям'і, кантактныя тэлефоны).

**Надзея ДРЫЛА.** *dryla@zviazda.by*

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

**ПАКАШТУЙЦЕ!**

## ГРАЧАНЫЯ ТЭФТЭЛІ

***Для тэфтэляў:*** *500 г любога фаршу, вараная грэчка (па аб'ёме яе павінна быць крыху больш, чым мяснога фаршу), 2 яйкі, 2 сярэднія цыбуліны (здрабніць у блэндары), 2—3 ст. л. маянэзу, соль, перац.* ***Для падліўкі:*** *1 вялікая морква, 1 цыбуліна, 1 ст. л. таматнай пасты, 2—3 шклянкі вады, 2 зубчыкі часнаку, соль, перац.*



Змешваем усе інградыенты для фаршу. Фарміруем тэфтэлькі (можна абкачаць іх у муцэ) і абсмажваем з двух бакоў на алеі. Потым перакладваем у невялікую каструльку.

Для падліўкі надзіраем моркву на тарцы для карэйскай морквы, цыбулю рэжам паўкольцамі, не вельмі тонка. Абсмажваем злёгку ў той жа патэльні з алеем, дзе смажыліся тэфтэлі. Потым дадаём таматную пасту, ваду, соль, перац, часнок. Змешваем і даём пакіпець 2 хвіліны. Потым выліваем соус на тэфтэлі ў каструльку і ставім на сярэдні агонь тушыцца на 20 хвілін.

Гатовыя тэфтэлі можна есці з любым гарнірам або салатай з агародніны.

## ЯБЛЫЧНЫ ПІРОГ «3 ШКЛЯНКІ»

***Спатрэбіцца:*** *крупа манная — 1 шклянка, мука — 1 шклянка, цукар — 1 шклянка, разрыхляльнік — 1,5 ч. лыжкі, яблыкі — 5 шт. сярэдняга памеру, лімонны сок — 3 ст. лыжкі, малако для залівання — 1 шклянка, ванілін — 1 г.*

Для пачатку змешваем усе сухія прадукты: манку, муку, цукар, разрыхляльнік, ванілін. Яблыкі трэба ачысціць і надзерці на буйной тарцы. Адразу ж апырскаць надзёртыя яблыкі лімонным сокам — інакш хутка пацямнеюць.

Бяром форму для выпякання, змазваем яе маргарынам або маслам, раўнамерна высыпаем шклянку нашага сухога цеста, накладваем пласт яблыкаў, потым зноў сухая сумесь і яблыкі. І яшчэ адзін слой сумесі і яблыкаў.



Перад тым як паставіць пірог у духоўку, раўнамерна заліваем яго шклянкай вельмі гарачага — проста кіпячага — малака, акуратна пры дапамозе нажа або відэльца пратыкаем пірог, каб малако дастала да ніжняга пласта.

Выпякаецца гэты пірог каля 50 хвілін у духоўцы, разагрэтай да 180 градусаў. Пірог нетрадыцыйны, але вельмі смачны. Пасля астывання выдатна трымае форму, не рассыпаецца.

Дарэчы, некаторыя гаспадыні не заліваюць пірог малаком, а зверху пакрываюць пластом надзёртага на буйной тарцы масла (грам 100—150). Атрымліваецца таксама вельмі смачна. Можаце паспрабаваць абодва варыянты.

**РАПТАМ СПАТРЭБІЦЦА**

## ЯК ХУТКА ВЫСУШЫЦЬ АБУТАК



У гэтым дапаможа соль. Разагрэйце яе на патэльні, усыпце ў шкарпэтку, шкарпэтку з соллю змесціце ў вільготны абутак. Праз некаторы час замяніце шкарпэтку з соллю на новую, калі з першай спробы прыбраць усю вільгаць не ўдалося. Абутак высыхае імгненна!

**ВАРТА ВЕДАЦЬ**

## ПАСТКІ ДЛЯ ПАКУПНІКОЎ

• Вялікая цялежка = вялікія траты. Пустая прастора цялежкі выклікае ўнутраны дыскамфорт і цалкам вытлумачальнае жаданне хутчэй прастору запоўніць.



• Па дарозе да касы пакупнікоў чакаюць розныя перашкоды — у літаральным сэнсе слова. То тут, то там мы натыкаемся на вялікія скрынкі з хадавым таварам. Прадаўцы ведаюць, што пакупнік больш схільны здзяйсняць імпульсіўныя пакупкі, калі тавар выстаўлены проста на праходзе.

• Найбольш запатрабаваныя прадукты — малако, хлеб, сыр, каўбасы — крамы часта размяшчаюць у самым далёкім куце памяшкання. Гэтыя тавары патрэбныя практычна ўсім, але, пакуль вы да іх даберацеся, напэўна, убачыце шмат чаго яшчэ.

• Знакамітыя «фінальныя распродажы», «поўныя ліквідацыі» і «зніжкі ў сувязі з адкрыццём крамы» — гэта не больш чым спробы пазбавіцца ад заляжалага тавару (і, трэба сказаць, яны заўсёды прыносяць вынік).

• Крамы і рэстараны часта ўзбуджаюць апетыт смачнымі пахамі. Асабліва дзейсныя пахі свежай здобы і кавы.

• Тавары для дзяцей заўсёды ляжаць нізка. Калі не хочаце істэрык з нагоды чарговага «Кіндэр-сюрпрызу», саджайце дзяцей на цялежкі.

*ДАПАМАГАЮЧЫ ДЗІЦЯЦІ НАВУЧЫЦЦА РАБІЦЬ ШТОСЬЦІ САМОМУ, ВЫ ДАЯЦЕ ЯМУ ЎПЭЎНЕНАСЦЬ У СВАІХ СІЛАХ (з энцыклапедыі Мантэсоры).*

**Адказная за выпуск Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

# ДЛЯ МАЛІТВЫ І НЕ ТОЛЬКІ

**Пасля рэвалюцыі 1917 года ў Беларусі не будавалі сінагог. І вось яе, як кажуць будаўнікі, узведзеную з нуля, адкрылі ў Віцебску. У перакладзе з іўрыта яе назва «Шацёр Давіда». Цырымонія адкрыцця стала падзеяй міжнароднага маштабу, бо на ёй прысутнічалі іншаземныя госці: рабіны і прадстаўнікі іўдзейскіх абшчын.**

Будынак узвялі недалёка ад Смаленскага рынку, на вуліцы Грыбаедава. На ёй ёсць помнікі архітэктуры, і па дарозе да храма можна «перанесціся ў часе». Недалёка на суседняй вуліцы — будынак, які раней выкарыстоўваўся вернікамі. Ён з'явіўся некалькі дзясяткаў гадоў таму.

Шмат ахвотных было фінансаваць будаўніцтва. У частцы адной са сцен — цэгла з імёнамі ахвярадаўцаў.

**Рабін Віцебска Малкіэль ГАРГОДЗЭ** паведаміў, што сінагога паралельна стане культурна-асветніцкім цэнтрам. Тут можна будзе паслухаць лекцыі, паглядзець фільмы па тэме іўдаізму, убачыць выставы. Запланавана стварыць і музей, прысвечаны жыццю іўдзеяў у Віцебску.






Фота Аляксея СПАТКАЯ.

Новую сінагогу пабудавалі па ўнікальным праекце. Ёсць шкляны купал, вялікія круглыя вокны, шматузроўневая столь. Унутры на ўсходняй сцяне — некалькі камянёў з Іерусаліма. Як расказаў **Леанід ТОМЧЫН, старшыня Віцебскай іўдзейскай абшчыны**, новабудоўля адпавядае ўсім рэлігійным канонам. Узводзілі каля двух гадоў.

Паводле слоў **Міхаіла ДАНІЛЕНКІ, саветнік старшыні Віцебскага аблвыканкама**, адкрыццё сінагогі — падзея знакавая не толькі для віцебскіх іўдзеяў. Ён нагадаў, што менавіта ў Беларусі нарадзіліся адраджальнік іўрыта Элізэр Бен-Егуда, першы прэзідэнт Ізраіля Хаім Вейцман, іншыя знакамітасці. І, зразумела, Віцебск вядомы ўсяму свету, у першую чаргу, дзякуючы земляку, мастаку Марку Шагалу. Дарэчы, вельмі сімвалічна, што ўнутры новай сінагогі копіі знакамітых шагалаўскіх вітражоў «Дванаццаць кален Ізраілевых».

Падчас акупацыі Віцебска фашысты знішчылі каля 20 тысяч яўрэяў. А ў канцы пазамінулага стагоддзя, згодна з данымі перапісу насельніцтва, іх колькасць перавышала 50% жыхароў горада. Калісьці ў правінцыйным гарадку было каля 60 сінагог і іўдзейскіх малельных дамоў.

На свяце прысутнічалі прадстаўнікі каталіцкага і праваслаўнага духавенства. Добрае надвор'е, яўрэйскія музыка і песні стварылі асаблівы настрой. Нават дах будынка стаў імправізаванай канцэртнай пляцоўкай: там іграў скрыпач. Ён, быццам бы сышоў з палотнаў Шагала. Свята без перабольшвання запомніцца надоўга. І, магчыма, з часам у горадзе стане сінагог больш. Захаваліся рэшткі старадаўняга будынка на вуліцы Рэвалюцыйнай і фундамент Вялікай сінагогі ў раёне цяперашняй вуліцы Калініна.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

## Новыя кнігі

# Аб роднай прыродзе песню спяваем

**«Мастацкая літаратура» падарыла чытачу зборнік мастацкіх твораў**




Кніга так і называецца — «Аб роднай прыродзе». Дзясяткі аўтараў выказваюць сваё захапленне беларускімі краявідамі ў вершах і прозе. Адкрывае зборнік, які можна смела браць у якасці дапаможніка і на ўрокі геаграфіі, на ўсе прыродазнаўчыя дысцыпліны, верш Уладзіміра Караткевіча «Беларуская песня». «Дзе мой край? Там, дзе вечную песню пяе Белавежа, / Там, дзе Нёман на захадзе помніць варожую кроў, / Дзе на ўзвышшах Навагрудскіх дрэмлюць суровыя вежы / І вішнёвыя хаты глядзяцца ў шырокі Дняпро...» І яшчэ з Караткевіча: «Ты — наш край. Ты — чырвоная груша над дзедаўскім домам, / Лістападаўскіх знічак густых фасфарычная раць, / Ты — наш сцяг, што нікому, нікому на свеце, нікому / Не дамо абсмяяць, апаганіць, забыць ці мячом зваяваць...»

У кнізе прадстаўлены як творы класікаў, пісьменнікаў ранейшых пакаленняў, так і вершы, і проза нашых сучаснікаў: Андрэя Федарэнкі, Віктара Карамазава, Віктара Шніпа, Навума Гальпяровіча, Васіля Зуёнка, Алеся Бадака, Раісы Баравіковай, Валерыя Гапеева, Людмілы Рублеўскай, Алеся Наварыча, Анатоля Бутэвіча, Алеся Жука, Георгія Марчука. Зборнік падзелены на раздзелы адпаведна порам года — «Вясна», «Лета», «Восень», «Зіма». Шкада, што кніга, выдадзеная, дарэчы, тыражом 1500 экзэмпляраў, — без ілюстрацыйнага матэрыялу. Хоць ад гэтага яе мастацкі ўзровень ніколькі не ніжэйшы. Можна смела раіць выданне і школьнікам, якія збіраюцца дэкламаваць найлепшыя творы беларускай літаратуры на конкурсах, у праекце «Жывая класіка», выкарыстоўваць як аргументы любові да роднай старонкі ў сачыненнях і іншых пісьмовых работах. Зборнік «Аб роднай прыродзе», укладзены вядомым паэтам Віктарам Шніпам, — уражальны напамін, што тэма прыроды з'яўляецца зараз, была раней ці не галоўнай мастацкай магістраллю беларускай літаратуры.

**Сяргей ШЫЧКО**

# СВЯТЫНЯ НА СХІЛЕ



## Каложскія страсці

Узнаўлялі святыню, што называецца, усёй грамадой. Значную частку грошай выдзеліў імператар Аляксандр ІІ. Праваслаўным духавенствам быў аб'яўлены збор сродкаў на дабудову мураваных сцен. На аб'явы ў газетах адгукнулася нямала буйных мецэнатаў і простых грамадзян. І астатнюю частку сабралі даволі хутка. Праект і каштарыс складаліся ў Пецярбургу.

Будаўніцтва вызваўся весці гродзенскі купец, які планаваў асвоіць грошы за некалькі гадоў, але неўзабаве адмовіўся ад заказу. У ходзе работ высветліць, што схіл працягвае спаўзаць і мураваную сцяну не вытрымае. На яго ўмацаванне патрэбны новы праект. Пачалі разбірацца. Адзін з высокіх чыноўнікаў наогул выказаў прапанову перанесці царкву ў бяспечнае месца, але супраць выказаліся прагрэсіўныя дзеячы навукі і культуры, у тым ліку гродзенскі губернатар і епіскап. У рэшце рэшт, на некалькі дзесяцігоддзяў Каложу паставілі на кансервацыю. Расходы ўзялі на сябе лесапрамыслоўцы, якія, уласна кажучы, адыгралі не апошнюю ролю ў частковым знішчэнні храма. Гэта іх плаціна пагоршыла сітуацыю з рэчышчам Нёмана.

## Драўляны ці мураваны?

Пасля спрэчак імператарская камісія спынілася на праекце, згодна з які разбураныя сцены замянілі больш лёгкай канструкцыяй з брусчатых стоек, абшытых звонку дошкамі. Дах таксама быў драўляны. На ім устанавілі купал з ажурным чыгунным пазалочаным крыжам. Напрыканцы XIX стагоддзя храм узнавілі і асвяцілі. Але спрэчкі вакол старажытнай святыні не сціхлі. У пачатку XX стагоддзя менавіта духавенства ставіць пытанне аб узнаўленні Каложы ў яе першапачатковым выглядзе. Гэта азначала, замяніць драўляныя сцены мураванымі, паводле існуючых. Царкву зноў паставілі на кансервацыю. У 30-я гады вярнуліся да рэканструкцыі, бо па сценах пайшлі расколіны. Перш-наперш, умацавалі схіл.

У савецкі час тут месціўся філіял гісторыка-археалагічнага музея, а затым — філіял музея гісторыі рэлігіі і атэізму. У 1991 годзе храм вярнулі праваслаўным вернікам, але праблемы з пагрозай разбурэння не зніклі. Наадварот. Паводка 1995 года паказала, што калі ўсё пусціць на самацёк, Каложа проста спаўзе ў Нёман. Вось тады і пачаліся самыя фундаментальныя работы па ўмацаванні схілу, якія доўжыліся 10 гадоў. У каложскі бераг былі ўцісныты 23 буравыя свідравіны з анкернымі балтамі. Была аказана падтрымка з боку ЮНЕСКА, бо царкву якраз унеслі ў Спіс помнікаў сусветнай спадчыны. Час патрабаваў рамонту і самога будынка, але на гэта ўжо не хапіла сродкаў.

## Новы віток у ратаванні храма

Да выратавання святыні на працягу апошніх гадоў спрабавалі падключыць жыхароў Гродзеншчыны, але, як паведамілі ў абласным упраўленні ідэалогіі, сабраць неабходныя сродкі не ўдалося. Пакуль нарэшце на праблему не звярнуў увагу кіраўнік краіны. Па загадзе Прэзідэнта, на рамонтныя работы сёлета ў ліпені было выдзелена каля 200 тысяч рублёў. Якраз цяпер ідзе асваенне сродкаў.



Вось цяпер, калі драўляную сцяну адкрылі, можна ўбачыць, наколькі своечасова пачаліся работы. Асабліва ўражвае стан бэлек на фундаменце. Яны значна прагнілі, у многіх месцах — проста трухлявыя. Ды і сам фундамент часткова сыплецца. **Галоўны інжынер ААТ «Гроднажылбуд» Сястаслаў НАВІЦКІ** пералічвае асноўныя стадыі рамонту: выраўняць сцяну, змяніць абшыўку, уцяпліць, усталяваць новыя вокны і дзверы, замяніць бэлькі. Як-ніяк яны прастаялі больш за сто гадоў. А вось каркас застанецца, як і дах. Перакрываць яго праект не прадугледжвае. Ён будзе толькі часткова ўзняты.



Аварыйная бэлька Каложы.

Будаўнікі адказваюць не толькі за якасць работ, але і за якасць матэрыялаў, таму самі купляюць лес і вырабляюць бетон. Дарэчы, тут працуюць тыя, хто мае вопыт работы на гістарычных аб'ектах. І гэта вельмі важна, лічыць **галоўны інжынер інстытута «Гроднаграмадзянпраект» Максім СЕЛЯДЦОЎ**. Тут патрэбен дасканалы, кропкавы падыход, які накіраваны на тое, каб не нашкодзіць, а наадварот, выправіць папярэднія недарэчнасці.

Тое, што царква набліжаецца да аварыйнага стану, пацвердзілі даследаванні падчас распрацоўкі праекта. Вырашылі захаваць асноўны каркас, два іншыя пласты замяніць. Сцены па завяршэнні плануюць пафарбаваць спецыяльным лакам «пад дуб». Спецыяліст не ўтойвае, што і дах патрабуе рамонту, але не гэтым разам. Цяпер галоўная задача — аднавіць драўляную сцяну.

*Каложская царква пабудавана ў першай палове XII стагоддзя ў часы княжання Барыса і Глеба Усевалададавічаў і ў іх гонар асвячоная. Гэта адзіны аб'ект гродзенскай архітэктурнай школы, які дайшоў да нас. Яго асаблівасць — шліфаваныя булыжнікі ў сцяне і каляровыя маёлікавыя пліткі ў выглядзе крыжоў. Цікава, што яны захавалі сваю афарбоўку з тых часоў. А яшчэ ў сцяне ўбудавана мноства збаноў-галаснікоў, якія надаюць асаблівую акустыку. Кажуць, што на адной з цаглін (плінфаў) захаваўся старажытны адбітак пальца, яго заўважыў адзін са святароў. На яго думку, гэты адбітак застаўся ад будаўніка царквы. Як відаць, яна тоіць у сабе не адну таямніцу.*

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

| Извещение о проведении повторного аукциона | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | |
| **Продавец** | ОАО «Брестоблресурсы», г. Брест, ул. Красногвардейская, 112/1 | | |
| **Предмет аукциона Месторасположение – Брестская область, г. Ивацевичи, ул. Загородная, д. 4** | | | |
| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
| **Здание гаража** | здание специализированное автомобильного транспорта | 240,6 кв. м | 122/С-12453 |
| **Забор металлический** (инв. № по бухучету 00001047) | | 104,3 м. п | – |
| **Начальная цена с НДС 20% – 24 410,64 бел. руб. (цена снижена на 50%)** | | | |
| **Сведения о земельном участке:** пл. **0,2613 га**, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания гаража с установленными ограничениями: охранная зона линий электропередачи, площадь 0,0282 га. | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 15** рабочих дней после проведения аукциона | | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона:** 30% от цены продажи имущества, с учетом ранее внесенной суммы задатка, оплачиваются в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи, оставшаяся сумма оплачивается ежемесячно равными долями в течение 6 (шести) последующих месяцев и индексируется исходя из индексов цен производителей промышленной продукции производственно-технического назначения. Ежемесячный платеж осуществляется в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня опубликования индексов цен производителей промышленной продукции производственно-технического назначения | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | | | |
| Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» 24.08.2017 | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **30.11.2017 в 15.00 по адресу:** г. Минск, ул. Казинца, 4, ГО «Белресурсы» – управляющая компания холдинга «Белресурсы», 3-й этаж, актовый зал | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **28.11.2017 до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки» | | |
| **Контактные телефоны** | +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by | | |

белагропромбанк
традиции будущего

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» сообщает, что в соответствии с решением Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк», на основании предложения Правления ОАО «Белагропромбанк» 10 ноября 2017 года проводится внеочередное Общее собрание акционеров в заочной форме.

Место нахождения общества, место и время проведения собрания: 220036, г.Минск, проспект Жукова, 3, 15.00.

## Повестка дня

Об утверждении изменений и дополнений в Устав ОАО «Белагропромбанк».

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 1 ноября 2017 года.

С материалами по вопросам повестки дня лица, имеющие право на участие в Общем собрании акционеров, могут знакомиться по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк» (г. Минск, проспект Жукова, 3) **с 1 ноября по 8 ноября 2017 г.** ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 8.30 до 12.30.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы по месту нахождения акционеров, а также иметь при себе документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – дополнительно документ, подтверждающий полномочия).

Заполненные бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 8 ноября 2017 года по адресу: 220036, г.Минск, пр-т Жукова, 3, депозитарий ценных бумаг ОАО «Белагропромбанк» почтовой связью, нарочным по месту нахождения Правления банка и филиалов по месту нахождения лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, средствами факсимильной связи по телефону/факсу: 229 64 10 или 229 64 51 с обязательной последующей доставкой (досылкой) оригинала бюллетеня.

Принявшими участие в Общем собрании акционеров считаются лица, заполненные бюллетени которых получены ОАО «Белагропромбанк» в установленном порядке.

Телефон для справок: 8(017) 229 64 10.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности №2 13.01.2017, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

## ОАО «Гомельоблреклама», филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблсервис» (продавец) извещает о проведении 5 декабря 2017 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20%), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20%), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. №350/С-49003, площадью 505,5 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **склад.** Адрес: **Гомельская область, г. Гомель, ул. Богдана Хмельницкого, 77. Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000006005489** площадью **0,0997 га** – для размещения объектов оптовой торговли, материально-технического и продовольственного снабжения, заготовок и сбыта продукции **(право постоянного пользования)** | **112 000,00** | **1 120,00** |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблсервис». Контактный тел. 8 (029) 690-00-10 – Беланов Руслан Николаевич. **Шаг аукционных торгов – 5%. Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблсервис»):** р/с BY76 ALFA 3012 2306 0600 2027 0000, БИК ALFABY2X, в ЗАО «Альфа-Банк», УНП 40007121 , назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления);
**2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 2 ноября 2017 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 1 декабря 2017 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**.Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** торгов в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы»**

## ОАО «Гомельоблреклама», филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Свитязь» (продавец), в лице управляющего в деле о банкротстве – директор ЧУП по оказанию услуг «АспектРеформа» Ангельцовой Н. А. извещает о проведении 4 декабря 2017 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20%), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20%), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Местонахождение лотов №1–82: Гомельская область, г. Рогачев, ул. Белинского, 54а. Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние | | | |
| 1 | Станок вертикально-сверлильный СВА-2, инв. №03001 | **400,00** | 40,00 |
| 2 | Станок сверлильно-пазовальный СВА-2М, инв. №03002 | **600,00** | 60,00 |
| 3 | Станок сверлильно-пазовальный СВА-2М, инв. №03003 | **600,00** | 60,00 |
| 4 | Станок для высверливания СВАСА-2, инв. №03004 | **800,00** | 80,00 |
| 5 | Обдирочно-шлифовальный станок 3Б-634, инв. №03019 | **600,00** | 60,00 |
| 6 | Станок доводочный СД-120, инв. №03479 | **1 100,00** | 110,00 |
| 7 | Станок фрезерный ВФК-2, инв. №02005 | **500,00** | 50,00 |
| 8 | Станок настольно-сверлильный 2М 112, инв. №00220 | **300,00** | 30,00 |
| 9 | Станок настольно-сверлильный, инв. №02043 | **73,00** | 7,30 |
| 10 | Станок строгальный С25-4А, инв. №01002 | **2 400,00** | 240,00 |
| 11 | Станок шлифовальный, инв. № 01009 | **82,00** | 8,20 |
| 12 | Фрезерно-копировальный станок, инв. №01013 | **160,00** | 16,00 |
| 13 | Станок круглопильный ГМ-146 инв. №01069 | **500,00** | 50,00 |
| 14 | Станок токарный по дереву ТП-40 инв. №04001 | **460,00** | 46,00 |
| 15 | Станок плоскошлифовальный ШЛПС-7 инв. №04003 | **600,00** | 60,00 |
| 16 | Станок универсально-фрезерный СФ-676, инв. №04024 | **3 500,00** | 350,00 |
| 17 | Станок универсально-фрезерный 676 ТОК, инв. №07021 | **3 500,00** | 350,00 |
| 18 | Станок универсальный 3Е-642, инв. №06174 | **4 600,00** | 460,00 |
| 19 | Станок токарный УТ-16 ПМ, инв. №06436 | **4 000,00** | 400,00 |
| 20 | Станок токарно-винторезный 16К20М002, инв. №06336 | **600,00** | 60,00 |
| 21 | Станок токарно-винторезный 1Е618М (марка станка фактическая С1Е61ВМ), инв. №06253 | **700,00** | 70,00 |
| 22 | Станок заточки плоских ножей ТЧН6-5, инв. №06072 | **1 100,00** | 110,00 |
| 23 | Станок заточки круглых пил ТЧПА-6 инв. №06073 | **1 800,00** | 180,00 |
| 24 | Станок заточки рамных пил ТЧПА-5, инв. №09001 | **2 000,00** | 200,00 |
| 25 | Станок фуговальный СФ-6-1А инв. №09010 | **1 000,00** | 100,00 |
| 26 | Станок фуговальный СФ-6-1А инв. №09011 | **700,00** | 70,00 |
| 27 | Станок рейсмусовый СР-6-9, инв.№. 09012 | **1 200,00** | 120,00 |
| 28 | Станок шарнирно-маятниковый ЦМЭ-3А , инв. №09013 | **1 500,00** | 150,00 |
| 29 | Станок гвоздезабивальный 2ЯГ – 1, инв. №09015 | **400,00** | 40,00 |
| 30 | Станок пятипильный ЦДК-5-2, инв. №09018 | **1 500,00** | 150,00 |
| 31 | Станок однопильный ЦА-2А, инв. №09021 | **1 200,00** | 120,00 |
| 32 | Станок круглопильный Ц 6-2, № 09023 | **1 000,00** | 100,00 |
| 33 | Пресс склеивания дверей 939-6, инв. №04062 | **3 900,00** | 390,00 |
| 34 | Машина рубильная навесная МРН-1, инв. №00050 | **1 100,00** | 110,00 |
| 35 | Компрессор С-412М (до 8 атм.произв.до 20 м. куб), инв. №00016 | **150,00** | 15,00 |
| 36 | Компрессор СО-243-1 (до 80 атм. произвд. до 20 м. куб./мин), инв. №00015 | **490,00** | 49,00 |
| 37 | Воздухонагреватель ANTARES, инв. №03094 | **320,00** | 32,00 |
| 38 | Воздухонагреватель ANTARES, инв. №03095 | **320,00** | 32,00 |
| 39 | Воздухонагреватель ANTARES, инв. №00040 | **320,00** | 32,00 |
| 40 | Бетоносмеситель СБ-250/380, инв. №00045 | **370,00** | 37,00 |
| 41 | Бетоносмеситель ЕСЩ СМ-160 (Латвия), инв. №70031 | **60,00** | 6,00 |
| 42 | Установка для приемки и выдачи раствора, инв. №00068 | **1 200,00** | 120,00 |
| 43 | Тара для раствора ТР-2 (металлическая), инв. №00017; Ящик для раствора ТР-2, инв. №00054; Ящик для раствора ТР-2, инв. №00055 | **330,00** | 33,00 |
| 44 | Емкость для цемента металлическая, инв. №01161; Емкость для цемента металлическая, инв. №01162; Бетоносмесительная установка МА-500, инв. №01004 | **21 500,00** | 2 150,00 |
| 45 | Штукатурная станция СШ-6-СО-50-АМ, инв. №42038 | **1 900,00** | 190,00 |
| 46 | Штукатурная станция СШ-6-СО-50-АМ, инв. №42039 | **1 900,00** | 190,00 |
| 47 | Растворонасос СО-50А, инв. №04036 | **700,00** | 70,00 |
| 48 | Растворонасос СО-50А, инв. №00074 | **700,00** | 70,00 |
| 49 | Емкость 25 м³ метал.д/бензина, 1996 г. в. инв. №02017 | **4 100,00** | 410,00 |
| 50 | Емкость 25 куб. м, металл./для дизтоплива, инв. № 01016 | **4 100,00** | 410,00 |
| 51 | Бензоколонка А-50, инв. №02036 | **450,00** | 45,00 |
| 52 | Бензоколонка А-50, инв. №02037 | **450,00** | 45,00 |
| 53 | Тележка траверсная, инв. №01622 | **410,00** | 41,00 |
| 54 | Вышка телескопическая Т – 4302, инв. №05026 | **390,00** | 39,00 |
| 55 | Вентилятор, инв. №04089 | **90,00** | 9,00 |
| 56 | Таль электрическая ГП-3,2 т, инв. №04017; Кран козловой ККТ-5, инв. №01074 | **13 100,00** | 1 310,00 |
| 57 | Рама лесопильная Р-63-4Б, инв. №09016 | **5 700,00** | 570,00 |
| 58 | Бытовка передвижная КУНГ КМ-131, инв. №01123 | **210,00** | 21,00 |
| 59 | Бытовка передвижная КУНГ КМ-131, инв. №01124 | **210,00** | 21,00 |
| 60 | Бытовка передвижная, инв. №01120 | **200,00** | 20,00 |
| 61 | Бытовка передвижная, инв. №01122 | **220,00** | 22,00 |
| 62 | Бытовка, инв. №01086 | **270,00** | 27,00 |
| 63 | Бытовка инв. №01087 | **270,00** | 27,00 |
| 64 | Автобус ПАЗ 32053, 2007 г. в., рег. №АВ1886-3, инв. №051098 | **5 900,00** | 590,00 |
| 65 | Автокран МАЗ 5335-КС 3562Б, 1982 г. в., рег. №АВ9365-3, инв. №00171, г/п 10тн | **5 200,00** | 520,00 |
| 66 | Автокран МАЗ 5337-КС 3577, 1991 г. в., рег. №ЕВ4352, инв. №01101, г/п 14тн | **7 300,00** | 730,00 |
| 67 | Автомобиль ГАЗ 3110, 2002 г. в., рег. №4308ЕАВ, инв. №50030 | **2 200,00** | 220,00 |
| 68 | Автомобиль МАЗ 5549,1990 г.в., г/п 8 тн, рег. №АЕ0268-3, инв. №01061 | **4 200,00** | 420,00 |
| 69 | Автомобиль МАЗ 5336602, 2002 г.в., г/п 9,8 тн, рег. №ЕС7451, инв. №50432 | **8 900,00** | 890,00 |
| 70 | Прицеп МАЗ 83781041, г/п 10 тн, 2004 г. в., рег. №Е2298А, инв. №50433 | **5 600,00** | 560,00 |
| 71 | Автомобиль ВАЗ 21213, 2000 г. в., рег. №6927ВЕ-3, инв. №51099 | **2 500,00** | 250,00 |
| 72 | Автомобиль ЗИЛ-ММЗ №-4502 АДП-243, рег. №АК1175-3, 1991 г.в., инв. №00401 | **2 500,00** | 250,00 |
| 73 | Автомобиль УРАЛ 5557, г/п 5,5 т., седельный тягач, рег. №ЕА4645,1990 г. в., инв. №01062 | **17 500,00** | 1 750,00 |
| 74 | Автомобиль ГАЗ 3307,бортовой, г/п 4,5тн., рег. №ЕС 6076, инв. №00421 | **2 400,00** | 240,00 |
| 75 | Полуприцеп МАЗ 93801, бортовой г/п 13,5 тн, 1981 г. в., рег. №0192ЕВ, инв. №01068 | **1 500,00** | 150,00 |
| 76 | Полуприцеп ОДАЗ 9357, бортовой г/п 11 тн, рег. №6649ЕА, год выпуска – н/о, инв. №01088 | **1 000,00** | 100,00 |
| 77 | Прицеп РЛ-551,бортовой, г/п 1 тн, инв. №5026 | **130,00** | 13,00 |
| 78 | Автопогрузчик 4081 (Львовский), 1989 года выпуска, инв. №00349 | **4 700,00** | 470,00 |
| 79 | Автопогрузчик УНЦ-060, инв. № 00370 | **1 700,00** | 170,00 |
| 80 | Бульдозер Д-606 до 75лс, инв. № 02041 | **4 100,00** | 410,00 |
| 81 | Экскаватор ЭО3323А,1991 г.в., рег. № н/д, инв. №01102, Трактор-погрузчик (экскаватор до 0,4 м³) | **6 000,00** | 600,00 |
| 82 | Экскаватор ЭО3322Д,1984 г.в., рег. № н/д, инв. №02040 | **6 000,00** | 600,00 |

**Продавец:** ОАО «Свитязь», в лице управляющего в деле о банкротстве – директора ЧУП по оказанию услуг «АспектРеформа» Ангельцовой Н. А. , тел. 8 (029) 696-70-06. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY34-BAPB30122093700130000000, БИК BAPBBY23912, Филиал ОАО «Белагропромбанк» ГОУ, УНП 400071204,ОКПО 285728963000, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 2 ноября 2017 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга», в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 1 декабря 2017 г. в 16.00 включительно.** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**.Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** торгов в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **7 (семи) рабочих дней** и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 №415-3 (ред. От 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» Ст. 127. **Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by**

